НАША НІВА

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у панядзелкі. №22 (141) 13 ВЕРАСЬНЯ 1999г.

Янка Брыль: «Такая культурнасьць і такая цемра нашых людзей»

Пра ўзьяднаньне Беларусі, пра нямецкі палон, пра сябра, які перайшоў савецкую мяжу, пра будучыню — чытайце на старонцы 3.

60 ГАДОЎ АДЗІНСТВА, 60 ГАДОЎ ЧАКАНЬНЯ

У 1939 годзе пачалася савецкая акупацыя Польшчы, якая ў нашу гісторыю ўвайшла як «узьяднаньне Заходняй Беларусі»

Фота Анатоля Клешчука.

Заходняя Беларусь, Жалудок (Гарадзеншчына), рынак

У гэтай падзеі няма і ня можа быць адзінай трактоўкі. Голы факт выглядае так: 17 верасьня 1939 году Савецкі Саюз (Сталін) паводле ўзаемнай дамовы зь Нямеччынай (Гітлер) напаў на Польшчу. Для Расеі гэта быў «вызваленчы паход». А на захадзе Беларусі яго дагэтуль называюць «вызваленьнем ад хлеба». Чалавечыя, нацыянальныя, культурныя і сацыяльныя страты беларусаў ад гэтага паходу з часам ператварыліся ў хранічную недасьпеласьць нацыі. Для Польшчы гэта была банальная акупацыя. Але што нам да тога? Саветы акупавалі нашу ўжо акупаваную Польшчай зямлю. Такім чынам, нібыта неаспрэчным застаецца для нас факт узьяднаньня, але й тут ня ўсё выглядае адназначна.

Сталін мэханічна зьляпіў Заходнюю, польскую, і Ўсходнюю, савецкую, часткі Беларусі ў адно. Пасьля алоўкам абкарнаў новае цэлае з краёў да тых памераў, якія сам сабе прыдумаў. Беларусь узьядналася, але ў цэлым істотна зьменшылася. Нашы землі з нашымі людзьмі адышлі да Польшчы, Літвы, Латвіі і Расеі. Пэрспэктыва ўзьяднаньня іх з этнічнай мэтраполіяй была фактычна пахаваная. Памножаныя на сацыяльную непрывабнасьць мэтраполіі, працэсы адчужэньня адбыліся. Беласток зусім ня прагне сёньня вярнуцца назад у Беларусь. Тое самае можна сказаць пра Віленшчыну і Дзьвіншчыну. Вось якое ў выніку атрымалася «ўзьяднаньне».

Далей. Прыляпіўшы да БССР Віленскі край, Сталін неўзабаве перадумаў і адрэзаў гэты кавалак Літве. У літоўскую гісторыю гэты факт увайшоў як аднаўленьне справядлівасьці — як суб'ектны літоўскі чын, нягледзячы на тое, што гэта была Сталінава прыхамаць. Але Вільню заняло літоўскае войска, і краіна яшчэ пэўны час існавала як незалежная ад Савецкага Саюзу. У нашым выпадку Заходнюю Беларусь занялі не беларусы, а Чырвоная Армія. Зямля стала фактычна часткай Расеі. І адміністрацыя панаехала расейская, пачаліся калгасы і русіфікацыя. Гэта было не суб'ектнае беларускае дзеяньне.

І вось тут варта згадаць пра заходнебеларускіх палітыкаў. Адных аўтарытэтных імёнаў мы ведаем дзясяткі, дзясяткі грамадзкіх арганізацыяў, каласальныя магчымасьці. Цяпер у нас сіляцца сабраць 100-тысячны мітынг, а тады адна толькі Грамада налічвала столькі сяброў. Аднак пры гэтым пад Польшчай у беларусаў не было ніякіх сэпаратысцкіх ці хоць бы аўтанамісцкіх памкненьняў! Вось дзе парадокс. Аніякае гатовасьці пры зьмене ўлады тут жа заняць кіраўнічыя месцы. Я не кажу пра магчымасьці, але гатовасьці не было!

Рэч тут у тым, што сэпаратызм яны прамянялі на сацыялізм. Вера ў байкі пра райскае жыцьцё за ўсходняй мяжой, дзялёжка маскоўскіх грантаў і чаканьне Чырвонае Арміі — усё гэта ператварала іх з суб'ектаў палітыкі ў цалкам залежных ад Масквы фігурантаў. Гэта пры тым, што ў Маскве ўжо складаліся сьпісы на іхнае зьнішчэньне. Сярод палітыкаў запанавала дэпрэсія, бо адбылася падмена мэтаў. Што ты будзеш рабіць, калі ўсё залежыць ад вонкавых абставінаў. Антон Луцкевіч публічна пакінуў палітыку і аддаўся культурніцкай дзейнасьці.

Нешта падобнае можна назіраць і сёньня, калі незалежнасьць краіны падмяняюць разважамі пра дэмакратыю. У выніку тое самае — дэпрэсія і бясконцае чаканьне чагосьці звонку.

Наступствы 17 верасьня перасьледуюць Беларусь і сёньня. І ня толькі сярод палітыкаў. Найвялікшай стратаю для беларускай сьвядомасьці і культуры стала страта Вільні. Старая калыска нацыянальнай культуры, асьвечаная імёнамі Скарыны, Каліноўскага і «Нашай Нівы», у міжваенным часе, пад Польшчай, мела неафіцыйны статус сталіцы Заходняй Беларусі. Менавіта гэты рэгіён, населены беларускамоўнай сялянскай масай, карміў горад і даваў яму кадры работнікаў і студэнтаў.

Колькасьць віленскіх беларускіх пэрыёдыкаў вымяралацца трохзначнымі лічбамі.

Працяг на старонцы 6.

зь Беларусі за суботу й нядзелю

Пазьняк ня пойдзе ніяк

На Сойме БНФ у суботу вырашылі, што другі этап зьезду адбудзецца 30—31 кастрычніка. Ідэю Зянона Пазьняка пра разьдзел Фронту на дзьве арганізацыі не падтрымалі і прынялі рэзалюцыю «Не дапусьціць расколу!» Вызначылі, што рашэньне Пазьняка аб адхіленьні Баршчэўскага ад пасады і прызначэньні асобнага зьезду партыі БНФ неправамоцнае. Тады частка паслоў Сойму адмовіліся рэгістравацца і самі аб'явілі Сойм неправамоцным. І ўвесь гэты сьмех з-за аднаго лідэра, які ня ўмее хораша сысьці.

Такія дактары

У Берасьці адзін чалавек, Уладзімер К., захварэў на гемарой, пайшоў да дактароў, тыя яму выпісалі лекі, а не сказалі, што яны несумяшчальныя з алькаголем (мо й ня зналі). А ён увогуле ня піў, але трохі выпіваў. Ну, і зьеў тых таблетак ды ўвечары трохі выпіў — ужо два тыдні ў энцэфалітным стане ляжыць у рэанімацыі.

Зь Берасьця — Аляксандра Коўтун

Свая гордасьць



Учора ў клюбе «Тытанік» скончыўся першы ў гісторыі гейфэстываль «Gay Pride Belarus `99". У пятніцу пачатак конкурсу хараства «Трансьмісія-99» (конкурс пераапрананьняў у жанчыны) сарвалі амонаўцы ў чорных масках з аўтаматамі. Яны ўварваліся і сталі ўсіх абшукваць. Быццам бы шукалі наркотыкаў, але нічога не знайшлі. Адзін удзельнік конкурсу ня даўся абшукваць сябе, дык яго зьбілі. Квіткі на фэстываль каштавалі 2 мільёны.

Ксяндзы ня п'юць

У Лаздунах Івейскага раёну адбыўся антыалькагольны духоўны ўрок. Сабраліся людзі, якія пастанавілі пазбавіцца дрэннай звычкі, і тыя, якім гэта ўдалося, а таксама сьвятары. Былі нават два ксяндзы, якія даўно перасталі быць алькаголікамі і цяпер усім пра гэта распавядаюць. Дамовіліся ў канцы верасьня сабрацца зноў. Прычым запросяць гэтым разам яшчэ й жонак ананімных алькаголікаў, і праваслаўных папоў-п'яніц. Прыдумаў такія спатканьні лаздунскі пробашч М.Ільляшэвіч.

БАСу — 10

18 верасьня Беларускае аб'яднаньне студэнтаў у Польшчы (БАС) адзначыць свае 10-я ўгодкі. З нагоды ў Супрасьлі ў культурным асяродку «Пушча» адбудзецца ўрачыстая вечарына. Сярод запрошаных – гарадзенскі бард Віктар Шалкевіч. Мяркуецца, што й Сяржук Сокалаў-Воюш з Прагі пад'едзе.

З Горадні — Антон Лабовіч

Фота Анатоля Клешчука.

Заходняя Беларусь, Друя (Браслаўшчына), манашка

«Што думаюць пра нас іншыя» — такім пытаньнем задалася польская газэта «Rzeczpospolita». Напярэдадні 60-годзьдзя разгрому «панскай Польшчы» польская газэта зьвярнулася да беларускіх палітыкаў, журналістаў, пісьменьнікаў, каб яны распавялі пра вобраз Польшчы — пасьля дзесяцігодзьдзяў антыпольскай прапаганды, пасьля крыўдаў 20—30-х гадоў, пасьля крывавых канфліктаў між праваслаўнымі й каталікамі пад час другой сусьветнай вайны. Што такое каталіцкае і што такое польскае для беларусаў?

Чытайце на старонцы 8.

Пуцін у Менску зь візытам-інспэкцыяй

Сёньняшні напаўкаляніяльны статус Беларусі цалкам задавальняе расейскае кіраўніцтва

Першы афіцыйны замежны візыт пасьля прызначэньня прэм'ер-міністрам Яўген Прымакоў нанёс у Беларусь. Замяніўшы яго, Сяргей Сьцяпашын паўтарыў манэўр «вялікага маўчуна». Замяніўшы Сьцяпашына, Уладзімер Пуцін таксама вырашыў, што адкрываць сэзон візытаў лепей з «братняй Беларусі». Прэм'ер-міністар Пятроў, які ўзначаліць расейскі ўрад калі не пасьля выбараў у Думу, дык пасьля прэзыдэнцкіх выбараў у Расеі, можна не сумнявацца, мэтай сваёй першай замежнай паездкі абярэ таксама Беларусь.

Думаецца, што прычыны такой любові да «сястрычкі» тлумачыць толькі сардэчнымі прыхільнасьцямі расейскіх прэм'ераў было б запроста. Прычына такой нашай папулярнасьці ляжыць хутчэй у сфэры псыхалёгіі. Наносячы падобныя візыты, расейскія кіраўнікі выкарыстоўваюць Беларусь як палігон, на якім можна ўпершыню адчуць сябе другой асобай вялікай краіны, не баючыся пры гэтым, што на перамовах вы пачуеце ня вельмі прыемныя для сябе рэчы. Заўжды сардэчны беларускі народ у асобе свайго «першага чалавека» не пакрыўдзіць дэбютанта гнюснасьцямі кшталту эканамічных ці тэрытарыяльных праблемаў.

Працяг на старонцы 5.

лісты ў рэдакцыю

Два журналісты выйшлі з БАЖу

Сябры Віцебскай гарадзкой філіі Беларускай Асацыяцыі Журналістаў, рэдактар газэты «Выбар» Барыс Хамайда і журналіст «Вітінфармбюро» Юрась Карпаў заявілі пра свой выхад з гэтай грамадзкай арганізацыі. Яны даслалі ў рэдакцыю ліст, дзе тлумачаць сваё рашэньне наступным чынам:

«Пры канцы жніўня ў Віцебскую філію БАЖ даслалі новы Статут арганізацыі. У Статуце зьявілася дапаўненьне: «ГА «БАЖ» дзейнічае ў адпаведнасьці зь дзеючай Канстытуцыяй РБ, Дэкрэтам Прэзыдэнта РБ ад 26.01.99г. №2 «Аб некаторых мерах па ўпарадкаваньню дзейнасьці палітычных партыяў, палітычных саюзаў, іншых грамадзкіх аб'яднаньняў». Мы разглядаем гэта як прызнаньне прэзыдэнцкай канстытуцыі. Паколькі мы прытрымліваемся ў сваёй грамадзка-палітычнай дзейнасьці Канстытуцыі 1994 г., мы ня маем намеру працягваць сваё сяброўства ў арганізацыі, якая фактычна прызнала дзяржаўны пераварот».

Аўтары дэмаршу канстатуюць зьмяншэньне ўплыву беларускамоўных журналістаў, асабліва з рэгіёнаў, у БАЖы. Варта нагадаць, што зьмены ў Статуце прынялі на апошнім зьезьдзе арганізацыі.

Беларускі відэаклюб

Як правесьці вольны час беларускамоўнаму беларусу? З кнігамі праблем амаль няма. З музыкай больш-менш лёгка — часам здараюцца канцэрты беларускамоўных гуртоў, ёсьць касэты, раней былі свае дыскатэкі (часам яны зноў зьяўляюцца й зьнікаюць). Але гэтага мала.

Апошнім часам зьявілася яшчэ адна магчымасьць адпачыць па-беларуску. Цяпер беларусы могуць бавіць свой час ля экрану, бо штосуботу а 18-й гадзіне на сядзібе ТБМ (Румянцава, 13) адбываюцца прагляды відэастужак (мастацкіх, мультыплікацыйных) на беларускай мове: «Ісус», «Пяты элемэнт», «Страчаны сьвет: Юрскі парк-2», «Салодкі яд каханьня», «Дарога на Курапаты», «Прыгажуня ў сонным лесе», «Аліса ў краіне цудаў», «Балта» і іншыя. Відэатэка ўвесь час пашыраецца. У «Беларускім відэаклюбе» ТБМ Вас чакае адпачынак у атмасфэры роднай мовы і добрая кампанія.

Віталь Станішэўскі

ДЗІЎНАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ

8–9 верасьня 1999 г. у Беларускім дзяржаўным музэі вялікай айчыннай вайны праходзіла навуковая канфэрэнцыя «Пярэдадзень і пачатак другой сусьветнай вайны».

Спэктар выступоўцаў быў розны: ад кандыдатаў гістарычных навук да студэнтаў гістфаку БДУ. Прысутнічалі на канфэрэнцыі таксама генэрал-маёр авіяцыі пісьменьнік Сульянаў, прадстаўнік Міністэрства культуры й прадстаўнік нямецкага пасольства. Пра надзвычайнасьць (або «звычайнасьць») канфэрэнцыі мяне папярэдзілі яшчэ пры ўваходзе — прыйшоў сумнавядомы прафэсар Залескі. Для недасьведчаных патлумачу: Адам Залескі і ягоная кампанія — гэта група гісторыкаў старой загартоўкі, вядомыя выключна артадаксальнымі поглядамі. Напрыклад, тры гады таму Залескі на старонках «Народнай Газеты» паставіў пад сумнеў сталінскія рэпрэсіі, зьменшыўшы іхную колькасьць у некалькі разоў і назваўшы іх абгрунтаванымі і правільнымі.

Калі ня браць пад увагу выступы некаторых нармальных дасьледнікаў, дык уражаньне такое, быццам патрапіў у мінулае. Тут дамінаваў стары савецкі падыход і адсутнічаў які-небудзь плюралізм. Большасьць выступоўцаў у лепшых традыцыях камуністычнай гістарыяграфіі цьвердзіла, як заходнія беларусы начамі ня спалі ў 1921—1939 г., марылі пра савецкую ўладу, распавядала жудасьці пра фашыстоўскую дзяржаву Польшчу ў міжваенны пэрыяд. Апафэозам быў зварот археоляга Побаля да прадстаўніка нямецкага пасольства з патрабаваньнем, каб немцы цяпер аднавілі мост, разбураны імі ў ягонай вёсцы яшчэ ў чэрвені 1941 г. і не адноўлены да гэтага моманту.

На «круглым стале» А.Залескі са сваімі прыхільнікамі гістарычнай праўды зноў праехаліся па непажаданых выступоўцах, падкрэсьлілі ў чарговы раз перавагу *«клясавага падыходу»* ў гісторыі, раскрытыкавалі сучасныя падручнікі па гісторыі, назваўшы іх «сорасаўскімі», а г.зн. прадажнымі. Адзін з гэтых гісторыкаў з радасьцю паведаміў шаноўным прысутным, што іхная гістарычная суполка рыхтуе да выданьня падручнік гісторыі Беларусі савецкага пэрыяду, дзе будзе ўсё праўдзіва раскладзена па палічках.

Назіральнік

ПАМЁР БЕЛАРУСКІ ПАДПОЛЬШЧЫК

У жніўні ў Горадні памёр Уладзімер Кісель, сябра падпольнага Саюзу Змаганьня за Незалежнасьць Беларусі (1946—49).

Ён нарадзіўся ў 1922 годзе ў Клецку. Пад час нямецкай акупацыі вучыўся ў Нясьвіскай настаўніцкай сэмінарыі, дзе зь сябрамі стварыў падпольны «Саюз беларускіх патрыётаў». Летам 1944 г. застаўся ў Беларусі, настаўнічаў. У 1946 годзе Кісель (псэўданім «Раса») удзельнічаў у нелегальным арганізацыйным сходзе «Саюзу Змаганьня за Незалежнасьць Беларусі» (СЗНБ), кантактаваў з камандзірам беларускага партызанскага атраду Іванам Раманчуком («Ястраб», кіраўнік СЗНБ). Арганізацыя дзейнічала ў Заходняй Беларусі, зьбіраючы патрыятычныя сілы, якія ў выпадку вайны павінны былі выступіць у абарону беларускага народу і незалежнасьці Бацькаўшчыны. Атрад Раманчука ваяваў з бальшавікамі на вялікім абшары каля Нясьвіжу, Стоўпцаў, Клецку.

На пачатку 1949 году прайшлі арышты сяброў СЗНБ. 25 лютага 1949 г. быў арыштаваны ў Горадні Ул.Кісель. Яго бальшавікі асудзілі на 25 гадоў канцлягераў. Толькі ў 1960-ым Уладзімера Кісяля вызвалілі, і ён вярнуўся ў Беларусь.

Дзякуючы канспірацыі, частка структур СЗНБ не была раскрытая. Толькі ў сакавіку 1998 году Ул.Кісель упершыню напісаў пра арганізацыю ў гарадзенскай «Пагоні». Ён чакаў, што прыйдзе час, калі можна будзе назваць імёны ўсіх удзельнікаў «Саюзу Змаганьня за Незалежнасьць Беларусі». На жаль, не дачакаўся... Сьветлая памяць!

Сяргей Ёрш

АРХІЎ НАЙНОЎШАЕ ГІСТОРЫІ
паведамляе, што ў сувязі з рэарганізацыяй
ранейшыя адрасы
(у тым ліку паштовая скрыня і e-mail)
і тэлефоны ня чынныя ад 9.IX.1999.
Пра новыя каардынаты будзе паведамлена ў бліжэйшы час.

знакам тым

«ПРА ГЭТЫХ»

Вольга КАРАТКЕВІЧ

Беларускіх дэмакратаў чакае цяжкае псыхічнае, маральнае і інтэлектуальнае выпрабаваньне — выпрабаваньне доступам да дзяржаных тэлебачаньня, радыё, газэтаў. Спраўджаная мара!

Незалежныя журналісты змушаныя будуць дапамагчы добрым людзям-палітыкам прадэманстраваць іх найлепшыя памкненьні. Задача незалежных журналістаў няпростая. Ім трэба думаць, як ня даць нашым апазыцыянэрам зноў кінуцца ў гістэрычныя рэтраспэкцыі пра цьвікі, крэдыты і ў «адкрытыя звароты да грамадзяніна Лукашэнкі». На экспэртную групу па доступе апазыцыі да дзяржаўных СМІ ў складзе Міхала Пастухова, Юр'я Тапарашава, Аляксандра Патупы і Ўладзімера Нісьцюка ўскладзеныя таксама вялікія тэхнічныя абавязкі — дамовіцца пра эфір, пераканаць улады, намовіць прыстойных журналістаў узяць удзел у кампаніі.

Але галоўная задача — стрымаць амбіцыі палітыкаў. Дэмакраты ў чаканьні рэваншу. Дэмакраты таксама людзі і, можа, нават больш людзі, чым палітыкі. Дэмакраты заўсёды гатовыя накрычаць на дурны электарат, прысарамаціць яго няведаньнем гісторыі Бацькаўшчыны, закідаць цёмны люд страшнай эканамічнай статыстыкай. Яны таксама гараць жаданьнем цягам прадастаўленых 3-х хвілінаў зьнішчыць народнага куміра Лукашэнку. І тым самым пахаваць сябе.

Я днямі брала ўдзел у адным фантастычным мерапрыемстве. Дасьведчаныя тэле- і радыёжурналісты прыкідвалі, каго з нашых (*нашых*) палітыкаў можна пусьціць у жывы эфір. Няхай не крыўдуюць суб'екты апазыцыйнай палітыкі, але сьпіс ураўнаважаных прадстаўнікоў апазыцыі аказаўся закароткі. Далей мы прыкідвалі, каму можна дазволіць гаварыць 10 хвілінаў, а каму варта дазволіць апэраваць толькі адной фразай.

Узровень гатовасьці дэмакратычных палітыкаў да тэле- і радыёэфіру вельмі яскрава характарызуецца тым, якую назву прапанаваў для сваёй перадачы адзін зь лідэраў апазыцыі — «Голас апазыцыі». Ну, ужо тут журналісты павесяліліся. Згадалі і «Куклы», і «Про это», і пасьля ў Зімоўскага — «Про этих».

Сытуацыя безвыходная. Вядома, што Лукашэнка ўсё адно падмане. Адмаўляцца ад перамоваў — значыць перакрэсьліць рэшткі павагі да апазыцыі з боку міжнародных структураў. Экспэртную групу ў любым выпадку будуць біць з усіх бакоў. На паседжаньні дэмакраты не далі слова сябрам экспэртнай групы Юр'ю Тапарашаву і Ўладзімеру Глоду. Тады апошні проста выйшаў са складу групы. Астатнія яшчэ вераць у магчымасьць дамовіцца з апазыцыяй, але нават Міхал Пастухоў, які ніколі не дазваляе сабе публічных эмоцыяў, заўважыў мне шматзначна: «Божа мой, што ж зь імі рабіць...»

Што рабіць? Прычасаць, напісаць сцэнар, пазычыць пінжачок, задаць разумнае пытаньне і своечасова перавесьці камэру на складзеную з разумных твараў аўдыторыю.

Другі кірунак супрацы некаторых журналістаў і дэмакратычных дзеячаў — акцыя 17-га кастрычніка. Абяцаюць 100-тысячную дэманстрацыю. ХартАктыў рыхтуе мерапрыемства ў кааліцыі зь некаторымі газэтамі і партыямі. У такую маштабнасьць верыцца мала. Традыцыйна шматлюдная акцыя ў гонар Бітвы пад Оршай сёлета сабрала каля тысячы чалавек. Цьмяны лёзунг «Беларусь, цябе чакае новая Ворша» выклікаў зусім не патрыятычныя пачуцьці. Не развучыліся актывісты-дэманстранты й гуляцца з прозьвішчамі расейскіх палітыкаў. Бедны чэкіст, для кар'еры якога кожны наступны выбух на абшарах нашага стратэгічнага партнэра можа стаць апошнім, таксама фігураваў у накляпаных транспарантах як «Рас-пуцін».

Лукашэнка ж чарговага разу перамяшаў печаны боб з сырым гарохам: «Узрывы жылых і грамадзкіх аб'ектаў у Маскве, якія выклікалі шматлікія чалавечыя ахвяры, ня могуць пакінуць раўнадушнымі беларусаў... На Беларусь аказваецца крымінагенны націск з паўднёвых і прыбалтыйскіх рэспублік...» У гэты кантэкст Лукашэнка чамусь увязаў плянаваную апазыцыяй масавую акцыю і заклікаў «не паддавацца на розныя заклікі апазыцыянэраў і не парушаць галоўнага здабытку грамадзтва — міру і спакою».

Ня ведаю, які эпітэт падбярэ ў такім разе Лукашэнка да запрашэньня афіцыйным літоўскім бокам дзесяці дэпутатаў Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня, якія 14 верасьня ў Літве будуць спазнаваць мэханізмы эканамічнага разьвіцьця і заадно наведаюць «закладніка Канстытуцыі» Сямёна Шарэцкага.

Дзякуй Богу, хоць з нашым сьпікерам пад час теледэбатаў у жывым эфіры праблемаў ня будзе. Па вядомых прычынах гучны голас і гнеўны твар Сямёна Георгіевіча мы, журналісты, будзем выкарыстоўваць у запісе. Для ахвотных гарантуюцца копіі для хатняга прагляду. ■

ЯМУ БЫЛО Б ТОЛЬКІ 50

17 верасьня спаўняецца 50 гадоў з дня нараджэньня Генадзя Карпенкі



17 верасьня 1999 году спаўняецца 50 гадоў з дня нараджэньня вядомага беларускага палітыка і вучонага, былога намесьніка Старшыні Вярхоўнага Савету, Старшыні Нацыянальнага выканаўчага Камітэту Беларусі, доктара тэхнічных навук, прафэсара, члена-карэспандэнта Нацыянальнай Акадэміі Навук Генадзя Карпенкі.

Яшчэ ня так даўна мы чыталі ў газэтах ягоныя эканамічныя аналізы і чулі на мітынгах палымяныя прамовы. Але, на жаль, вось ужо некалькі месяцаў яго няма з намі... Няма чалавека, пра якога безь перабольшаньня можна сказаць, што ён згарэў на працы.

Генадзя Карпенкі ня стала на 50-м годзе жыцьця. Гэта быў чалавек, поўны сілаў і задумак, аптымізму і веры ў будучыню сваёй Радзімы і свайго народу, які ён так любіў і імкнуўся заўжды быць зь ім. І наш беларускі народ плаціў яму тым жа. Гэта было яскрава бачна на яго пахаваньні. Без усялякай разнарадкі райкамаў партыі і райвыканкамаў людзі прыехалі з усіх куткоў краіны, каб у апошні раз паглядзець на Генадзя Дзьмітрыевіча і разьвітацца зь ім, як зь вядомым сучасьнікам, якім кожны сумленны беларус будзе заўжды ганарыцца.

Людзі ішлі, ішлі і ішлі... Несьлі вянкі і кветкі, несьлі сваю павагу чалавеку, які заўчасна іх пакінуў на нялёгкай дарозе.

Але ж Генадзь Карпенка не памёр. Ён сапраўды згарэў... Згарэў у палітычнай барацьбе, каб агнём свайго сэрца асьвятляць тую дарогу, якой ішоў сам, іншым — тым, хто, ідучы па ёй далей, працягвае распачатую ім і ягонымі паплечнікамі справу па вызваленьні краіны ад цемры, у якую пагрузіў яе дыктатарскі рэжым.

Ён застанецца ў памяці ўсіх, хто яго ведаў, як кіраўнік буйнога заводу і вядомы спартовец, мэр гораду Маладэчна і член-карэспандэнт Нацыянальнай Акадэміі Навук. Але асабліва яскрава запомніцца Генадзь Карпенка як палітык-дэпутат Вярхоўнага Савету XII скліканьня і арганізатар Партыі Народнай Згоды, намесьнік Старшыні Вярхоўнага Савету XIII скліканьня і Старшыня Нацыянальнага выканкаму. І разам з гэтым Генадзь Дзьмітрыевіч быў клапатлівым сынам, любімым мужам і паважаным бацькам дваіх дзяцей, дзедам, якога ўнукі будуць ведаць, на жаль, толькі па фотакартках.

Гэта быў жыцьцялюбны вясёлы чалавек, зь якім заўжды было ня сумна, ён любіў сяброў, кампанію і жарты. Хутка забываўся на крыўду і заўжды памятаў дабро.

Пра гэткіх цэльных людзей, як Генадзь Карпенка, можна сказаць словамі Напалеона, што «іх недастаткова забіць, іх трэба яшчэ й паваліць». І таму дыктатарскаму рэжыму ўдалося толькі забіць гэтага моцнага целам і душою чалавека. Але як асоба Генадзь Дзьмітрыевіч застаўся не пахаваным. Дыктатарскі рэжым ня здольны яго паваліць, як хлусьня і паклёп ня здольныя зьнішчыць праўду, за якую бароўся Генадзь Дзьмітрыевіч. Яго постаць будзе стаяць у гісторыі беларускага народу стагодзьдзі, доўжачы шэраг імёнаў вядомых барацьбітоў за свабоду й незалежнасьць сваёй Радзімы, якімі ганарыцца беларускі народ. Памяць гэткіх людзей жыве ў народзе ў назвах вуліц, навучальных установаў, прадпрыемстваў...

У той жа час чорнымі і нікчомнымі ценямі ў гэтай жа гісторыі, побач зь ценямі Мураўёва і Кубэ, Гея і Цанавы застануцца імёны забойцаў Генадзя Дзьмітрыевіча. Ад успамінаў аб іх кожнаму сумленнаму беларусу будзе рабіцца жудасна і гідка.

Яго пяцідзесяцігодзьдзе мы адзначаем, на жаль, безь яго. Але ўсе мы, яго сябры і паплечнікі па барацьбе, поўныя аптымізму і веры ў тое, што тая справа, за якую ён аддаў жыцьцё, пераможа. Беларусь будзе незалежнай, вольнай і дэмакратычнай рэспублікай!

Сямён Шарэцкі

Янка Брыль: «ТАКАЯ КУЛЬТУРНАСЬЦЬ І ТАКАЯ ЦЕМРА НАШЫХ ЛЮДЗЕЙ»

Мой шлях да Янкі Брыля нагадваў паломніцтва. Нягледзячы на тое, што ўстурыўся я а палове шостай раніцы, адзін з трох тыднёвых аўтобусаў са Стоўпцаў на Беражан пасьпеў такі зьехаць безь мяне. У стаўпецкай кнігарні, на паліцы «60 год яднаньня», сымбалічна стаялі «Палескія рабінзоны», а мне было наканавана пракульгаць 20 км па інтэграванай калісьці зямлі Заходняй Беларусі... У вясковага дзядзькі, што трохі падвёз мяне, я спытаўся пра самае лепшае, што прынесла яму 17 верасьня. Ён пацёр свой чырвоны нос і сказаў, што раней ён жыў на нейкіх там «крэсах», а цяпер, бадай, у самым цэнтры краіны. На маю заўвагу, што хутка мы зь ім можам ізноў зрабіцца крэсавякамі, толькі ўжо заходнімі, дзядзюк толькі махнуў рукой, маўляў, не дуры галавы.

Дзе жыве Янка Брыль, ведаюць усе жыхары навакольля, нават тамтэйшая «зіна з магазіна», якая адмовілася прадаць мне бутэльку «Лідзкага клясычнага» («Не мяшайце работаць! Відзіце, людзі хлеб ждуць, а Вы тут са сваім півам!»). Калі я, стомлены і змардаваны смагай, ужо набліжаўся да крынічанскай сядзібы пісьменьніка, мяне наведаў нейкі сумнеў і няўпэўненасьць: чалавеку за 80, хворы, відаць, а я тут...

Янка Брыль адразу зазначыў, што, увогуле, стараецца не даваць інтэрвію («Нашто камусьці нешта расказваць, калі я і сам яшчэ здольны пісаць?»), але вырашыў зрабіць выключэньне, бо гаротны карэспандэнт адмахаў пешшу 20 км... Так і праразмаўлялі мы пяць гадзінаў, седзячы на дварэ за сталом ля калодзежу зь вельмі смачнай сьцюдзёнай вадой.

Анатоль Прасаловіч

— 17 верасьня спаўняецца 60 гадоў з дня ўзьяднаньня Ўсходняй і Заходняй Беларусі. Як Вы цяпер глядзіце на тое ўзьяднаньне?

— Ну, можна талкаваць і так, і так: ведаем цяпер мы пра пакт Рыбэнтропа-Молатава, ведаем, што ўсё гэта было спланавана раней. Але вынік, які вынік? Што Беларусь узьяднана. Гэта была нібы папраўка, унесеная да Рыскага дагавору 21-га году. Была разьдзёртая папалам, а цяпер узьяднана. Каб яна, Бог даў, утрымалася так, у самастойнасьці, у незалежнасьці, дык чаго б яшчэ хацець было? Усялякія гістарычныя бываюць калізіі, усялякія зьмены-перамены, а важны вынік — узьяднаньне Беларусі. Так, праўда, яна абкарнаная, але наконт гэтай абкарнанасьці... Мы лічым, што яна абкарнаная, а літоўцы лічаць, што абкарнаная Літва.

— А як у той час людзі паставіліся да таго, што Вільню аддалі Літве?

— Мне цяжка сказаць, я магу гаварыць толькі з чужых словаў, бо быў тады на фронце і ў палоне, а як вярнуўся адтуль увосень 41-га, наступілі новыя часы. Не да Вільні было, калі ўжо занята было ўсё: і Вільня, і Менск, і пад самую Маскву ўжо дайшлі немцы. Тады ўжо пра гэта не гаварылася. Ясна, крыўдна. І чорт яго ведае, ёсьць некаторыя пункты на тэрыторыі Эўропы: Трыест, Гданьск быў, Адэса дамагалася, ды й Вільня магла б быць таксама, калі разумна падысьці, літоўска-беларускай сталіцай. Бо літоўцы толькі пасьля вайны зрабілі яе сваёй, іх там быў вельмі малы працэнт. Але яны сваю справу ведаюць, народ энэргічны, талковы.

— Што Вам памятаецца зь першых дзён другой сусьветнай?

— Як ведама, вайна пачалася з нападу немцаў на Польшчу, і вельмі шмат там палегла беларусаў ды ўкраінцаў, бо салдатаў з усходу дасылалі служыць на захад, і наадварот. Я мяркую па нашай Навагрудчыне: нашыя служылі, у лепшым выпадку, у цэнтральнай Польшчы. Я вот служыў у Гдыні, у батальёне марской пяхоты, дык там большая палова былі беларусы.

— Як складаліся адносіны паміж жаўнерамі-палякамі і непалякамі?

— Ніякай дзедаўшчыны не было, ні нацыянальнай, ні паміж старымі і маладымі. Былі такія вот спрадвечныя гульні дурныя, што, скажам, ідзе пяхота, а кавалерысты едуць і на іх: «трусь-трусь-трусь», «трусікі», а ўжо пяхота крычыць: «А вы кабыляжэ!» — кабыльнікі, значыць. А ў нацыянальным плане не было. Праўда, пад канец можна было заўважыць, ды й ня толькі ў арміі, дрэннае стаўленьне палякаў да ўкраінцаў, якія актыўна супрацьлялі паланізацыі. Да 1939 году супраць іх прадпрымаліся так званыя карныя пастоі, як было ў Беларусі ў сярэдзіне 20-х гадоў, калі была ў нас партызанка. А яшчэ, значыць, з габрэямі было. Яны служылі толькі ў цэнтры Польшчы, у нас у Гдыні іх не было, і афіцэры польскія заўжды падкрэсьлівалі, што мы маем гонар служыць там, дзе няма ніводнага жыда. Калі ж я служыў у Халме, мы дужа сябравалі з украінцамі. У выходныя дні звычайна выходзілі ў поле, песьні сьпявалі ўкраінскія, беларускія. Дык ім пазайздросьціць можна было. У нас быў звычайны салдат-артылерыст Апанас, дык ён усяго Шаўчэнку ведаў на памяць.

— Калі Вы ўпершыню пачулі пра ўзьяднаньне?

— 19 верасьня, калі мы здаліся немцам. Адзін афіцэр прыстаў да мяне: «Дынст грат?» Я троху са школы ведаў, кажу: «салдат, рэкрут» — і дастаў мэдаль сьмяротны, што на шыю чапляецца. Там імя, прозьвішча і ваенкамат баранавіцкі. Ён пытаецца: «Рускі?» Рускі, кажу, у сэнсе, беларус. А ён: «Рускі аўх пух-пух», што і рускія ваююць таксама.

У палоне жаўнераў польскай арміі ўсіх падзялілі: беларусы асобна, украінцы і палякі таксама. Газэты выходзілі па-беларуску, бэрлінская «Раніца», напрыклад, дзе я ўпершыню прачытаў вершы Ларысы Геніюш.

— У чым, на Вашую думку, палягала адрозьненьне ў творчасьці пісьменьнікаў з абодвух бакоў Беларусі?

— Мы на Захадзе мелі больш магчымасьцяў азнаёміцца з творчасьцю такіх літаратараў як Максім Гарэцкі, Алесь Гарун, чаго ў 30-х гадах у савецкіх школах ужо не чыталі. У нас у вёсках нават сьпявалі «Ой, ты, Нёман-рака» Цішкі Гартнага, «О край родны, край прыгожы» Коласа. Як беларушчыну ў канцы 20-х палякі прыціснулі, зьявіўся Танк, загрымеў. Ён хораша пісаў, за ім уся моладзь ішла, такі сапраўдны паэт. І іншыя былі — Васілёк, Ільляшэвіч, Машара — але найбольш нацыянальна акрэсьленым быў усё ж Танк, пасьля Таўлай Валянцін. У той час я быў знаёмы толькі з Васільком, мы зь ім нават адзін год былі разам у палоне, ды яшчэ з адным малавядомым, але харошым паэтам Юліянам Сергіевічам.

Яшчэ, памятаю, быў вельмі здаровы рух, скажам, супраць п'янства: моладзь ня піла. А калі хто піў, дык дзяўчыны не хадзілі зь ім танцаваць.

— Вы мяркуеце, што ва Ўсходняй Беларусі пілі болей?

— Дык а хто ж нас навучыў піць, заходнікаў, як ня ўсходнікі? У нас не было такога разуменьня: сто грам, шклянка... Я помню, раз на вясельлі адзін дзядзька заліхвацкі выпіў цэлую шклянку гарэлкі, дык усе стоячы глядзелі, ці разарвець яго, ці не. Да таго ж у нашай моладзі была вельмі высокая актыўнасьць у сэнсе мастацкай самадзейнасьці: ставілі спэктаклі і па-беларуску, і папольску, і нават па-яўрэйску. Але у 30-х гадох палякі пачалі моцна глушыць беларускае падпольле. Яны да Саветаў уцякалі, а іх там... Адзін мой блізкі сябар адсядзеў пяць год у польскай турме, уцёк, а ў СССР яму далі 25 «без права перапіскі». Адсядзеўшы 18 год, ён вярнуўся і два гады памераў ад раку. Я яго наведваю, а ён мне пачынае гаварыць: «Ня вер ім, гэта ўсё няпраўда! Я бег са сьлязьмі на вачах, убачыўшы першага краснаармейца, а праз два дні мяне цягнулі па падлозе менскай турмы, і я з роту крывёю паліваў падлогу».

— Якія адрозьненьні існуюць паміж заходнікамі і ўсходнікамі цяпер?

— Цяпер, кажуць, на Берасьцейскай і Гарадзенскай абласьцях трымаецца ўся сельская гаспадарка Беларусі. У нас яшчэ працуюць людзі, не развучыліся. Але зь іншага боку, раней Мір, прыкладам, быў такім культурным мястэчкам, ешыбот быў там габрэйскі сусьветна вядомы, шмат інтэлігенцыі. А цяпер ні газэтнага кіёску, ні кнігарні, толькі аддзел у прамтаварах, дзе замест кніжак туалетная папера ляжыць на паліцах. Таксама не магу сказаць, што ў нас захавалася больш беларушчыны. Хіба што толькі існуюць яшчэ этнаграфічныя адрозьненьні. Ды яшчэ тое, што там папы тлумяць народ: «Всё это Великая Россия!», а тут ксяндзы ў польскі бок цягнуць. Шмат існуе прыкладаў, калі краіна падзеленая рэлігійна. Вазьміце Нямеччыну: поўнач — пратэстанцкая, а поўдзень — каталіцкі. Але ўсе — немцы. А ў нас іншыя каталікі так і лезуць са сваёй пальшчызнай як жабы на корч.

— Што Вы можаце сказаць пра пісьменьнікаў Заходняй Беларусі, якія зьехалі ў эміграцыю?

— З мацнейшых — Сяднёў, Салавей, Арсенева... Яна, Ільляшэвіч і Геніюш пачалі друкавацца перад вайной, а іншыя дык там выраставалі на пісьменьнікаў. Вялікага бляску, на жаль, няма. Яны ня маюць такіх празаікаў, як нашыя Мележ, Пташнікаў ці Караткевіч. А паэты... Ну, Арсенева. Але ж нашыя Жэня Янішчыц ды Ніна Мацяш лепей пішуць. А ў Ларысы Антонаўны існуе арэол пакутніцы, сядзела столькі і мужна так паводзіла сябе, дык гэта надае асьвятленьне, афарбоўку ейнай творчасьці. Мяне, праўда, хвалюе заўсёды «Магутны Божа», але ж там яшчэ і музыка Равенскага вельмі харошая. Увогуле, ня трэба параўноўваць, хто большы, хто меншы. Для пісьменьніка важна, як той казаў, ці ён крывы, ці ён просты, галоўнае — чысьціня і чалавечнасьць. Паспрабуйце параўнаць Купалу з Коласам ці Славацкага зь Міцкевічам.

— А ці існаваў падзел на заходнікаў і ўсходнікаў у Саюзе Пісьменьнікаў?

— Аніякага. Мы ўсе былі разам. Мяне, прыкладам, прымалі ў члены зь Іванам Мележам. Адрозьненьні існавалі і існуюць, бадай, толькі ў моўным плане. Гэта можна заўважыць, параўноўваючы мову Адамчыка і Кудраўца, Стральцова і Голуба са Скоблам.

— Ці лічыце Вы магчымым, што ў будучыні Беларусь ізноў будзе падзеленая на дзьве часткі?

— Упэўнены, што не. А якія для гэтага ёсьць падставы? Можа, камусьці і хочацца, каб была Заходняя Беларусь і асобна Ўсходняя, але гісторыя, разьвіваючыся па сьпіралі, толькі набліжаецца, а не паўтараецца.

— А ўзьяднаньне Беларусі й Расеі?

— Ня будзе аніякага ўзьяднаньня, я не прызнаю ды й не хачу яго. Дружыць як самастойная дзяржава з самастойнай, выбіраць самому сабе друга на раўнапраўнай аснове — гэта адно, а тут папахвае зусім іншым. З адной стараны, бачыце, Ельцын сказаў: «Только в одно государство!» І ня будзе называцца Беларусяй гэтае «государство», будзе Расея. А наш ужо хоча ў віцэ-прэзыдэнты ці прэзыдэнты. Нават пагаворваецца, што ён можа стаць заступнікам Ельцына. Гэта ўсё ня мае пад сабой асновы, і таму не адбудзецца.

— Чаму частка беларускага народу падтрымлівае Лукашэнку?

— З аднаго боку, з-за дасюлешняга калгаснага ладу жыцьця вясковага люду, а з другога боку, безумоўна, з-за несьвядомасьці нашай. Я вось жыву ў вёсцы і зьдзіўляюся, як яно можа спалучацца: з аднаго боку, такая сёньняшняя зьнешняя культурнасьць людзей, а з другога — такая цемра, што яшчэ і ў ведзьмаў вераць. Дык чаму ж ім не паверыць у ведзьмака?

— Як, на Ваш погляд, будуць разьвівацца падзеі ў Беларусі ў бліжэйшыя гады?

— Тут я Вам нічога не скажу. Можна як хочаш вадзіць пальцам па вадзе, але як яно будзе... Вы ж улічыце такі фактар як фактар нечаканасьці. Такі паварот можа адбыцца, што Бог яго знае. У сучаснай сытуацыі ў многім самі мы вінаватыя, бо трэба навучыцца саміх сябе крытыкаваць. Віна нашая ў нашай інэртнасьці, расхлябанасьці такой, бесхрыбетнасьці, п'янстве і тым, што зараз называюць сэксам, а раней звалася, прабачце, напрошваецца слова... Усё разам гаворыць, што сьветлым сілам, што дбаюць аб незалежнасьці, годнасьці, чалавечнасьці, цяпер вельмі нялёгка. ■



Фота Анатоля Клешчука.

EURO-2000

«ТАЛЕРАНТНЫ» ФУТБОЛ

Фота IREX-ProMedia

Валійскія фанаты на стадыёне «Дынама»

Беларусі правяла 13 афіцыйных сустрэчаў (6 у адборачным цыкле да Чэмпіянату сьвету 1998 году і 7 у цяперашнім адборачным цыклі — да Чэмпіянату Эўропы 2000). Вынік: 11 паразаў, 2 нічыя, 0 перамогаў, розьніца забітых і прапушчаных мячоў 6—24. Апошнюю сваю афіцыйную перамогу зборная Беларусі атрымала яшчэ за Сяргея Бароўскага тры гады таму ў хатняй сустрэчы са зборнай Эстоніі. Пасьля такіх «посьпехаў» трэнэр мусіць падаваць у адстаўку. Праблема, аднак, у тым, што наўрад ці ў нашай краіне зараз знойдзецца спэцыяліст, які здолее перамагчы «талерантную» псыхалёгію нашых «куміраў».

Для таго, каб дакладна ўявіць сабе месца нашай зборнай у футбольнай Эўропе, дастаткова паглядзець на колькасьць набраных ачкоў — 2. Хто гуляе горш за нас? Зборныя Андоры, Люксэмбургу, княства Сан-Марына і Мальты. Зборная Ліхтэнштэйна, і тая набрала ў сваёй падгрупе 4 ачкі. Параўноваць жа нашыя паказчыкі з былымі суседзямі па «камэры» проста сорамна: латышы да апошняга змагаліся з нарвэжцамі і славенцамі за перамогу ў 2-й падгрупе, зборныя Літвы і Эстоніі на роўных гуляюць з шатляндцамі і да сёньня захоўваюць шанцы на паездку ў Бэнілюкс. І Арменія, і Азэрбайджан, і Малдова выступілі больш удала за зборную Беларусі.

А.А.

Калі пасьля хатняе паразы ад валійцаў зборная Беларусі адправілася ў Швэйцарыю, мала хто сумняваўся ў тым, які будзе вынік паездкі. Так і выйшла: беларускія футбалісты ізноў паказалі, як «упэўнена» і «прыгожа» яны ўмеюць прайграваць. Прычым зборная Швэйцарыі была на полі, у лепшым выпадку, ня горшай за беларусаў. І пераўзышла толькі ў адным — у волі да перамогі. Паўтарылася карціна, якую мы назіралі ў Кардыфе, Капэнгагене, у хатніх сустрэчах з тымі ж швэйцарцамі й валійцамі: беларусы даказалі ўсім, што яны ўмеюць гуляць, але ня ўмеюць выйграваць.

Самая частая думка, якую цяпер выказвае на прэс-канфэрэнцыях Міхаіл Вергяенка: не пашанцавала, прайгралі ўсяго адзін мяч і г.д. Больш верагоднае тлумачэньне — нашыя футбалісты ня ведаюць, за якую краіну гуляюць, не адчуваюць таго, што іхныя перамогі тут некаму патрэбныя. Ну, ня можа футбаліст зборнай аддаваць на полі ўсе сілы, калі кіраўніцтва краіны папросту ненавідзіць яе, а абсалютная большасьць жыхароў абыякавая да свайго ўласнага жыцьця.

Інтэрвію, якія даюць трэнэры і самі спартоўцы, робяць уражаньне, што яны выступаюць за зборную БССР, якой нечакана дазволілі выступаць самастойнай камандай. Пад кіраўніцтвам Вергяенкі і ягонага трэнэрскага штабу зборная

АТРЫМАЛІ ПА ЗУБАХ, А ПОТЫМ «СУТКІ»

8 верасьня вечарам менскія «скінгеды» захацелі адсьвяткаваць у сквэры Янкі Купалы Дзень беларускай вайсковай славы. Праўда, ідучы на акцыю, яны забыліся спароць са сваіх чорных куртачак палатняныя чырвона-зялёныя сьцяжкі. Нянавідныя сымбалі выклікалі энэргічную рэакцыю ў моладзі. Спачатку юнакі з Маладога Фронту, Беларускага Нацыянальнага Кангрэсу ды Партыі Свабоды паспрабавалі патлумачыць аднагодкам, што сапраўдны беларускі сьцяг — бел-чырвона-белы. Пасьля завязалася бойка. Нацыянал-радыкалы згуртаваліся і ўвалілі апанэнтам па баках.

Як потым стала вядома, астатніх «падцяжачнікаў» група амонаўцаў арыштавала ў глыбіні парку. 9 верасьня ў Цэнтральным судзе сталіцы над брытагаловымі прайшлі хуткія суды. Пяць паўналетніх бэйбусаў атрымалі па 15 сутак, непаўналетніх адпусьцілі.

P.S. Цікава, як ацэньвае паводзіны сваіх маладафронтаўцаў лідэр МФ?

Назіральнік

дзе варта быць

Ці ведаеце вы, што такое Вайшкуны? А дзе знаходзяцца Блакітныя азёры? Калі не, дык спытайце ў менскіх мастакоў, што часам жывуць і працуюць у гэтым ужо легендарным сярод багемы кутку. А лепш паспрабуйце адчуць, што гэта такое, завітаўшы на **выставу «Барвы Вайшкунаў»**. Яна ўрачыста адкрыецца 14 верасьня а 17-й гадзіне ў **Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва** (праспэкт Скарыны, 47). У экспазыцыі ўдзел возьмуць Ягор Батальёнак, Віктар Маркавец, Уладзімер Сулкоўскі й Аляксандар Шатэрнік.

17 верасьня тым, каму нешта гаворыць імя Сяргея Алейнікава, хто памятае беларускую футбольную восень 82-га, для каго слова «Дынама» ў тыя часы значыла славу Беларусі, варта быць на менскім стадыёне «Дынама». **Сяргей Алейнікаў**, зорка эўрапейскага футболу, выйдзе на газон у якасьці гульца апошні раз. Выйдзе ў складзе пастарэлага «Дынама» ўзору 82-га году, каб згуляць супраць састарэлай зборнай даўно ня існай краіны. Дзеля большага кайфу перад матчам варта выпіць «Жыгулёўскага», выкурыць пачак «Арбіты» й паслухаць «Песьняроў». Фанацець лепш пад флагам БССР.

14 верасьня ў 17.30 у Магілёўскім унівэрсытэце адбудзецца дыскусія з нагоды выйсьця нумару часопіса **«ARCHE»** на тэму «Кабеты». Чакаецца ўдзел Славаміра Адамовіча, Аляксандры Андрыеўскай, Зьмітра Бартосіка, Валеркі Булгакава, Адама Глёбуса, Андрэя Дынька, Касі Камоцкай. Даведацца можна праз тэлефон (0222) 25-57-85.

З надыходам восені ў Менску пачынае абуджацца тэатральнае жыцьцё. **14 верасьня** ў Доме афіцэраў «Малы тэатар» Ігара Забары дае **«ART»**, пастаўлены Мікалаем Пінігіным па п'есе Ясьміны Рэзы. Поўная тонкага гумару гісторыя мужчынскага сяброўства й выпрабаваньня яго на шчырасьць багемнаю атмасфэраю Парыжу. Пачатак а 19-й гадзіне. Цана квіткоў: 300—900 тыс. руб.

А наступнымі днямі **15 і 16 верасьня** на сцэне Палацу прафсаюзаў нас чакае новая сустрэча з рэжысурай Мікалая Пінігіна. Гэтым разам маэстра ў супрацоўніцтве з антрэпрэнёрамі У.Ушаковым, мастаком З.Марголіным і кампазытарам В.Канапацкім паставіў **«Бедную Лізу»**. Дзея мае інтрыгоўную назву «Вялікі дывэртысман па творы Мікалая Карамзіна». Выканаўцы: Зоя Белахвосьцік, Віктар Манаеў, Алена Ўнукава, Віталь Рэдзька. Апроч таго, у спэктаклі будзе жывая музыка камэрнага аркестру «Віртуозы сцэны». Пачатак а 19-й гадзіне. Цана білетаў: 360—1200 тыс. руб.

Сяргей БАЛАХОНАЎ

БЕЛАЕ БАЛОТА

Няўжо тая сьветлая, з прагалінамі, галава, якая дакумекала вярнуць савецкую практыку пасьлявэнэушнага разьмеркаваньня, спадзявалася на нераадольнае захапленьне выпускнікоў і гарачую прэданасьць родзіне ў асобе тав. МІ 0001 за вазможнасьць трудаўстройства? Шукаць лёгіку алягічнага гэтак жа складана, як калупаць у носе мезенцам левае нагі, калі ты, вядома, ня ёг...

Пасьля пяці гадоў ладнага навучаньня з дыплёмам зусім не абы-каго, я ня думаў і не жадаў патрапіць у вёску з рамантычнай назвай Белае Балота. Белае Балота — вёска пад Рэчыцай, але за 10 км ад чыгункі, калі шыбаваць па Залупінскім тракце, выкладзеным з плітаў з друзоўкаю гострых каменьчыкаў. Пэўна, нейкі расейскі праектоўца вычвараўся, настальгуючы па абсягах сваёй здаравеннай мэтраполіі, бо напрасткі ад станцыі было б кілямэтраў 5—6.

Некалі адзін мой сябар жартаваў, што Рэчыцкі раён у часы першабытнасьці ўваходзіў у арэал пражываньня нэгроіднай расы. У дачыненьні да Б.Б. гэта падалося зусім слушным. Нібыта даарыйскія аўтахтоны пабялелі разам із сваім балотам, захаваўшы рысы архаічнае сьвядомасьці. Адна настаўніца прагаварылася: «Ніхто із нас белым ня стаў, усе мы чорныя». Мо таму я гэтак лякаюся пэрспэктывы загрузнуць у Б.Б. усур'ёз і надоўга. Іх немагчыма зразумець. «Скажыце, калі ласка, а дзе тут у вас школа?» — спытаўся я ў людзей на ўскрайку вёскі. — «А хір яе знае. Хіба яна тут е?» — прагучэла ў адказ.

Яшчэ ў раённым аддзеле адукацыі мяне папярэдзілі, што дырэктар у белабалоцкай школе малады і очань дажа прагрэсіўны. Дырэктараў век сапраўды блукае між сарака а пяцюдзесяцьцю гадамі. Аб прагрэсіўнасьці сьведчыла адсутнасьць у ягоным кабінэце партрэта Лукашэнкі. Тамака вісіць ніштаватае палатно з чэрапам правадыра ўсясьветнае басоты. Абрывістасьць фразаў, загальмаванасьць у маўленьні і ў міміцы выказвалі агромністую тугу. Пазьней высьветлілася — то туга за савецкай імпэрыяй. Вось жа, «дземакрацыя давяла за 11 лет, спасу нет». Ён савецкі чалавек і жыве савецкімі катэгорыямі. У прамове на першага верасьня ён шверкануў аб спаборніцтве «капіталістычнай» і «сацыялістычнай» сыстэмаў адукацыі: «Іменна савецкі народ атправіл первым аар'іна. Іменна нашы савецкія учоныя создалі вадародную бомбу, штобы паказаць праціўнікам эфекціўнасьць нашай сісьцемы абразаванія». Я ледзь не прасьлязіўся сьлязою карэннага жыхара Тулы ці Разані, калі ў кабінэце фізыкі прачытаў цытату з І.Курчатава, якая пацьвярджала спасочаньні наконт дырэктаравых якасьцяў: «Я шчасьлівы, што нарадзіўся ў Расеі і прысьвяціў жыцьцё атамнай навуцы».

Школа ў Б.Б. беларуская, але на ўроках пануе большасьцю трасянка ды расейшчына. Між іншага, у школе ё піянэры ды БПСМ. Сакратаром першаснай ячэйкі маладых патріотов зьяўляецца дачка дырэктара й настаўніцы матэматыкі. Здаецца, будзе мне каму двойкі стаўляць. Дзеці ў школе розныя, але працаваць ахвоты мала і ў іх, і ў мяне.

— Разумееце, я тутака прымусова настаўнічаю.

— Што, сілай заставілі?! — не паверылі дзеці.

Затое ўжо на першых уроках я даведаўся, у каго бацька «галубы», колькі каштуе самагонка (200 тыс. удзень, 300 уначы), пачуў, што «дзевачак» у 10 клясе няма, што ў 8 клясе «е малы — настаяшчы алкаголік». Празнаў таксама, што вёска зусім не даарыйская, ёй 75 гадоў, а раньш там было балота зь белымі лілеямі й белымі бярозамі навокал. А жыхары Б.Б. завуцца проста балацянамі. ■

ЗЕМЛЯТРУС У МАЗГАХ

Землятрус у Турэччыне моцна зьмяніў турэцкае грамадзтва, разбурыў давер да палітыкаў, паспрыяў сталеньню грамадзянскай супольнасьці. Турэцкая прэса закляйміла ня толькі будаўнічую мафію, круцельства на будоўлях і карумпаванасьць чыноўнікаў, што давалі дазволы на будаўніцтва. Але яна належным чынам ацаніла таксама няздатнасьць уладаў арганізаваць выратавальныя работы.

Землятрус забіў 40 тысяч чалавек і пакінуў бяз даху яшчэ 200 тысяч. Але ён паказаў і тое, што турэцкае грамадзтва існуе. Зь першых дзён бязьдзейнасьць ураду й ваенных прыкра кантраставала зь незвычайнай салідарнасьцю насельніцтва: узьніклі тысячы прыватных грамадзкіх ініцыятываў для правядзеньня выратавальных работ і падтрымкі жывых. Урадоўцы яшчэ хлусілі, што сытуацыя пад кантролем, а сотні лекараў ужо ехалі ў пацярпелыя раёны. Недзяржаўныя структуры рэквізоўвалі зямлю й ставілі намёты, а рух транспарту кантралявалі добраахвотнікі, якія сачылі, каб самы патрэбны транспарт не тырчаў у заторах. Паліцыянты зьявіліся толькі праз 5 дзён.

Шмат людзей хацела памагчы ахвярам, але мала хто стаў ахвяроўваць свае грошы дзяржаве — іх давалі на рахункі прыватных дабрачынных фундацыяў, бо дзяржаве ўжо ня вераць.

Суцішыліся й палітычныя супярэчнасьці. Дзяржава ў цяжкую часіну аказалася бездапаможнай і нікчэмнай, што не магло не згасіць нацыяналістычнага чаду. За 45 сэкундаў катастрофы загінула больш людзей, чым за пятнаццацігадовую курдзкую вайну. Але абсурд дзяржаўнай палітыкі ў Курдыстане і ў крызыснай сытуацыі мае адны карані. Адзін прафэсар геалёгіі зазначыў у інтэрвію газэце «Milliyet», што Стамбульскі ўнівэрсытэт папярэджваў, каб у Ізьміце не будавалі нафтаперапрацоўчага заводу. На пытаньне, чаму ж парады навукоўцаў не ўплываюць на палітыкаў, ён адказаў: «А чаго вы чакалі? Калі старшыня парлямэнту зноў кажа, што курдзкая мова — гэта ня мова, а дыялект...» Праз колькі дзён пасьля трагедыі газэта «Huerriyet» надрукавала заклік аказваць дапамогу, прыняты кіраўніцтвам курдзкіх паўстанцаў — раней быў немагчымы і такі зварот, і такая публікацыя.

Той самы пераварот адбыўся і ў стаўленьні да другога спрадвечнага ворага: турэцкія СМІ радаваліся грэцкай дапамозе, а міністра аховы здароўя, які адмовіўся прыняць яе, газэты назвалі здраднікам і расістам.

Боль прымусіў грамадзтва думаць.

Сяргей Радштэйн

Скандал вакол Лукашэнкі

Так ніхто і не разабраўся, ці гэта праўда была ці «качка», што літоўскаму прэзыдэнту В.Адамкусу адразу былі не далі паветраны калідор, каб ён мог празь Беларусь заляцець у Ялту, на сустрэчу кіраўнікоў краінаў Балтыйска-Чарнаморскага рэгіёну. А не далі, маўляў, бо Лукашэнка пакрыўдзіўся, што яго на той форум не запрасілі як нелегітымнага прэзыдэнта.

Праўда, крыўдаў у Лукашэнкі на суседа можа быць шмат. Нездарма літоўскія газэты на ўсе лады гэта ўсё смакавалі. І што Адамкус церпіць у Вільні Сямёна Шарэцкага, не праганяе, і што літоўцы дазволілі беларускае радыё, якое будзе вяшчаць на Беларусь і за забарону якога Лукашэнка ўжо двойчы Адамкуса «паблагадарыў», і — гэта ўжо асабістае і таму самае моцнае — тое, як Адамкус сказаў пра Лукашэнку ў красавіку ў Вашынгтоне. Прыводзяць нават тую цытату: «Сёньня ўся ўвага — становішчу ў Югаславіі, пра Лукашэнку — маўчок. Альбо яго ігнаруюць, альбо ягонай дзейнасьці не надаюць ніякага значэньня. Лічу гэта памылковым. Будучы чалавекам непрадказальным, у будучыні ён можа стварыць праблемы. Трэба спадзявацца, што само жыцьцё пакажа Лукашэнку, што ён павінен зьмяніць свае погляды».

Радуюцца прэзыдэнты. На гэты раз пранесла з Лукашэнкам

Хто ж на такія крыўдныя словы не пакрыўдзіўся б!

А што да незапрашэньня Лукашэнкі ў Ялту, дык ініцыятарам гэтага быў не Адамкус, і нават не гаспадар Кучма, а польскі прэзыдэнт А.Квасьнеўскі. (Во абклалі, з усіх бакоў!) Польскі шэф Службы нацыянальнай бясьпекі Марэк Сівец, які езьдзіў у Крым з Квасьнеўскім, растлумачыў справу такім чынам:

— Наша пазыцыя адпавядае палітыцы Польшчы ў дачыненьні да Беларусі. Мы не прызнаем таго, як Лукашэнка ажыцьцяўляе ўладу. Ягоная прысутнасьць ускладніла б правядзеньне нарады. Такую самую думку маюць і лідэры іншых краінаў, што сабраліся ў Ялце.

А сабралася іх там адзінаццаць. І гаварылі яны ў Лівадыйскім палацы, дзе 54 гады таму «вялікая тройка» (Сталін, Чэрчыль і Рузвэльт) абмяркоўвалі паваенны падзел Эўропы. Напэўна, у словах пра тое, што прысутнасьць Лукашэнкі ўскладніла б форум, ёсьць сэнс. Бо ўсе памятаюць папярэднюю сустрэчу прэзыдэнтаў — у Вільні, дзе Лукашэнка нарабіў скандалу ў зьвязку з прыдуманым замахам на ягонае жыцьцё. Праўда, не разьлічылі прэзыдэнты, што адсутнасьць Лукашэнкі не пазбаўляе ад скандалу зь ягонай асобай. Так яно выйшла і на гэты раз.

Ліцьвін

Пуцін у Менску зь візытам-інспэкцыяй

Працяг са старонкі 1.

Якая эканоміка, хлопцы! Славяне мы, ці хто?!

Беларусь — самы прыемны і бесклапотны партнэр па перамовах, бо вызначаецца заўсёднай гатоўнасьцю вымавіць «так». А што яшчэ трэба пану?

Пад час усіх гэтых сустрэчаў мы чуем адныя і тыя ж фразы: «мы вас любім» — «мы вас таксама» — «дык давайце ж любіцца яшчэ мацней» — «давайце» — «вы хочацце быць галоўным? калі ласка» — «вы таксама хочаце быць галоўным? няма праблем» — «ну дык што, можа заўтра?» — «ммм...» Прызнацца, пачынаеш шкадаваць нашую першую асобу. Бедненькі і так мыкаецца, і так, і сьпераду гатовы пралезьці, і ззаду. Але ж не даюць, ворагі. Мяняюцца твары прэм'ераў, у вачох мільгаціць, а галава папросту адказваецца ўспрымаць іх усіх. Што Сьцяпашын, што Пуцін — адзін твар, адны словы. І вось трэба ўжо чацьверты-пяты раз заводзіць адну і тую ж нудотную мэлёдыю.

Пад час сустрэчы з Пуціным Аляксандар Лукашэнка выглядаў ня проста стомленым ад усіх гэтых бессэнсоўных размоваў. Падобна было, што яму ўсё цяжэй і цяжэй знаходзіць сынонімы адных і тых жа словаў. На гэтым фоне пастарэлага і ня ведаючага куды прыткнуцца прэзыдэнта Беларусі маладжавы і энэргічны Пуцін выглядаў яўна больш выгодна. Не сказаўшы нічога такога, чаго б не казалі ягоныя папярэднікі пад час такіх сустрэчаў, ён выканаў сваю галоўную мэту: візыт ветлівасьці насамрэч быў візытам-інспэкцыяй. Ці Беларусь нікуды ня дзелася, ці можна спакойна займацца справай.

А справы ў Пуціна зараз дзьве: выбары і Паўночны Каўказ. Дадайце да Ічкерыі і Дагестану праблемы ў Карачаі і Чаркесіі, канфлікт паміж Інгушэціяй і Паўночнай Асеціяй, і вы зразумееце, чаму так хвалюецца Лукашэнка. У сёньняшняй сытуацыі ніхто ў Расеі ня будзе ратаваць задубелую беларускую эканоміку і ніхто не рызыкне дадаць да ўсіх сваіх праблемаў яшчэ адну — драпежнага заходняга суседа.

Расейскія праблемы — выбары і вайна на Каўказе — шчасьце для Беларусі. Занятай самой сабой Расеі няма калі праглынуць свайго вернага хаўрусьніка. Сёньняшні напаўкаляніальны статус Беларусі цалкам задавальняе расейскае кіраўніцтва.

Андрэй Андрыеўскі



Учора ўвечары быў завершаны пошук людзей, якія загінулі ад выбуху ў 19-м доме на вуліцы Гур'янава ў Маскве. Руіны рыхтуюць да зносу. Паводле афіцыйных зьвестак загінулі 92 чалавекі. Тры кантэйнэры з парэшткамі знаходзяцца ў моргах для ідэнтыфікацыі. З усіх забітых пазналі пакуль толькі 60. Расейская пракуратура шукае чачэнцаў. Сёньня ў Расеі з нагоды выбуху ўсеагульная жалоба.

RADIO FREE EUROPE · RADIO LIBERTY

БЕЛАРУСКАЯ СЛУЖБА РАДЫЁ СВАБОДА

Беларускія перадачы Радыё Свабода выходзяць у эфір тройчы на дзень:

· ПЕРШАЯ ВЕЧАРОВАЯ ПЕРАДАЧА
18.00-19.30 паводле менскага часу (15.00-16.30 UTC)
7295 кгц (41.12 м)
9610 кгц (31.22 м)
11725 кгц (25.59 м)
15565 кгц (19.27 м)

· ДРУГАЯ (АБНОЎЛЕНАЯ) ВЕЧАРОВАЯ ПЕРАДАЧА
22.00-23.30 паводле менскага часу (19.00-20.30 UTC)
6105 кгц (49.14 м)
9535 кгц (31.46 м)
9750 кгц (30.77 м)
11865 кгц (25.28 м)

· РАНІШНЯЯ ПЕРАДАЧА
(ПАЎТОР ПЕРШАЙ ГАДЗІНЫ ДРУГОЙ ВЕЧАРОВАЙ ПЕРАДАЧЫ)
6.00-7.00 паводле менскага часу (3.00-4.00 UTC)
6065 кгц (49.46 м)
7295 кгц (41.12 м)
9635 кгц (31.14 м)
9750 кгц (30.77 м)

Апрача таго, усе нашыя перадачы перадаюцца на сярэдняй хвалі 521 м (576 кгц)

У праграме:
... навіны зь Беларусі і ўсяго сьвету, правы чалавека, апазыцыя, улада, родная мова, эканоміка, мэдыцына, культура, гісторыя, эміграцыя...

Спэцыяльныя перадачы:
... Праскі акцэнт, Вострая Брама, Блізкая Эўропа, Беларускі інтэрнэт (нд), Ад панядзелка да панядзелка (пн), Гаўдэамус, Беларускія раздарожжы (аўт), Неабжытая спадчына, Паштовая скрынка 111 (чц), Новае пакаленьне (пт), Сымбаль веры (сб)...



ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ ЧЫТАЧОЎ У МЕНСКУ

Каб чытаць сьвежы нумар «НН» у дзень выхаду – у панядзелак – і пры гэтым эканоміць час і грошы, афармеце падпіску ў бліжэйшым шапіку «Белсаюздруку», а атрымліваць газэту можна ў любым менскім газэтным шапіку.

Зь ліпеня 1999 г. падпіску «да запатрабаваньня» прымаюць 32 газэтныя шапікі. Менскі «Белсаюздрук» гарантуе выдачу газэты па падпісным абанэмэнце ў дзень выхаду газэты, а таксама захаваньне не забраных вамі асобнікаў праз увесь падпісны пэрыяд.

Кошт падпіскі на «НН» на месяц (з кастрычніка) – **192 000** руб. (4 нумары ў месяц, газэта выходзіць на 12 старонках). Падпіска «да запатрабаваньня» прымаецца да 23 дня перадпадпіснога месяца ў крамах і шапіках «Белсаюздруку» г. Менску. Даведацца і высьветліць няясныя пытаньні можна па тэл. 227-88-41 у спадарыні Натальлі Сьвятохі.

Падпіска па краіне на IV квартал 1999 году.
Кошт на 1 месяц - 212 000 рублёў, на 3 месяцы - 636 000 рублёў.

НАША НІВА

Ніжэй мы падаем сьпіс пунктаў, дзе можна падпісацца й забіраць газэту:

1. Кастрычніцкі пункт падпіскі, вул. Жукоўскага, 5, к. 1
2. Партызанскі пункт падпіскі, вул. А.Кашавога, 8
3. Першамайскі пункт падпіскі, пр. Ф.Скарыны, 113
4. Фрунзенскі пункт падпіскі, вул. Рам. Слабада, 9
5. Крама № 1 — вул. Жукоўскага, 5
6. Крама № 2 — пр. Ф.Скарыны, 44
7. Крама № 3 — пр. Ф.Скарыны, 76
8. Крама № 4 — вул. Леніна, 15
9. Крама № 6 — вул. Філімонава, 1
10. Крама № 7 — вул. Якуба Коласа, 69
11. Крама № 8 — вул. Сурганава, 40
12. Крама № 9 — пр. Ракасоўскага, 140
13. Крама № 10 — вул. Асіпенкі, 2
14. Крама № 11 — пр. Пушкіна, 77
15. Крама № 12 — вул. Кіжаватава, 80
16. Крама № 13 — вул. Каліноўскага, 82, к. 2
17. Крама № 14 — вул. Валадарскага, 22
18. Крама № 15 — вул. Танкавая, 16
19. Крама № 16 — вул. В.Харужай, 24
20. Крама № 17 — вул. Някрасава, 35
21. Крама № 18 — ст. м. «Плошча Перамогі»
22. Крама № 19 — пр. Машэрава, 51, к. 1
23. Крама № 20 — вул. Ясеніна, 16
24. Крама № 21 — станцыя мэтро «Пушкінская»
25. Крама № 23 — вул. Славінскага, 39
26. Крама № 24 — вул. Жылуновіча, 31
27. Шапік № 34 — гатэль «Менск», пр. Ф.Скарыны, 11
28. Шапік № 136 — ст. м. «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі Фізкультуры
29. Шапік № 187 — гатэль «Беларусь», вул. Старажоўская, 15
30. Шапік № 262 — гатэль «Плянэта», пр. Машэрава, 31
31. Шапік № 78 — гатэль «Юбілейны», пр. Машэрава, 19
32. Крама №25 — вул. К.Маркса, 21

ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 63125

60 гадоў адзінства, 60 гадоў чаканьня

Працяг са старонкі 1.

Паводле згадак старога віленчука Лявона Луцкевіча, у верасьні 1939 году, калі Вільню зрабілі сталіцай Заходняй Беларусі ўжо афіцыйна, ні ў кога ў горадзе гэта ня выклікала зьдзіўленьня. Літоўцаў на той час тут было ўсяго два працэнты. Новая ўлада, якая ва ўлётках па-беларуску пісала, што прыйшла сюды «на вякі», першай справай узялася за вываз тутэйшых беларусаў у Сібір. Праўда «вякі» працягнуліся менш за месяц. Аднак і таго месяца хапіла, каб абезгаловіць тутэйшую беларускую масу, бо вывезьлі першым чынам інтэлігенцыю. Як, дарэчы, і па ўсёй Заходняй Беларусі. Людзям, якія прысьвяцілі жыцьцё свайму народу, камісары пісалі ў прысудах адно слова: расстраляць.

Якой была б сёньня Беларусь, калі б тады, у 39-м, засталася зь Вільняй? Няма сумневу, што яна была б іншай. Без таго лішку русіфікацыі, які захрас у сьвядомасьці кожнага беларускага чалавека невытлумачальным стопарам, а краіну трымае на мяжы небыцьця, ня кажучы ўжо пра цывілізацыйнае адставаньне ад суседзяў — тых жа літоўцаў. Тут выйшла як у латарэі. Мы зь Вільняй адчувалі б, як нацыя, сваю поўную кандыцыйнасьць і значна лягчэй пакінулі б невядома чыю савецкую родзіну ў 91-м. А выйшла, што гэтая кандыцыйнасьць дасталася літоўцам, і сёньня яны гавораць пра сваё нацыянальнае адраджэньне як пра мінулы этап, які яны прайшлі бяз стратаў.

Яшчэ адно наступства — Лукашэнка. Выбар нацыі. Заходнебеларускія людзі пад Польшчай настолькі рашуча памянялі сваю нацыянальнасьць на сацыяльнасьць, што масава ірваліся за ўсходнюю мяжу. Яны, нібы матылёк на агонь, ляцелі ў той камуністычны рай, іх тут жа арыштоўвалі і расстрэльвалі як польскіх шпіёнаў, а абсалютная большасьць іхных супляменьнікаў у Польшчы пазірала на іх з зайздрасьцю і марыла пра прыход Чырвонае Арміі, за што палякі часта блыталі іхную нацыянальнасьць са словам «бальшавік». Яны выбіралі сацыялізм гэтаксама, як пасьля выбралі прэзыдэнта. Гэта той самы выбар. Яшчэ кажуць, што галасавалі яны ня за, а супраць — Кебіча. Слушна. Яны галасавалі супраць панылага і беднаватага польскага капіталізму за той сьветлы і малады калгасны лад, які праз гады ўвасобіўся ў пэрсоне дырэктара саўгасу.

Так ня наша гісторыя пра нас перацякае ў ня нашу сучаснасьць, у якой няўтульна ані старому камуністу, ані юнаму нацыяналісту. Ані гісторыку, які мучаецца над фармулёўкамі не сваёй гісторыі. 17 верасьня чарговы раз падказвае, *што* нам, нацыі і краіне, замінае ў разьвіцьці. Нельга жыць паводле чужых падручнікаў і ўяўленьняў, глядзець расейскую тэлевізію і чакаць аб'яднаньня з Расеяй гэтаксама, як продкі чакалі прыходу Чырвонае Арміі. Ні да чаго добрага гэта не прыводзіць. Нельга жыць, чакаючы.

Сяргей Паўлоўскі

Заходняя Беларусь, Нясьвіж, касьцёл

ПЕРАД «УЗЬЯДНАНЬНЕМ»

Якуб НАВАГРАДЦАЎ

1 верасьня 1939 г. у 5.45 нямецкія войскі напалі на Польшчу. 3 верасьня 1939 г. Францыя і Брытанія абвясьцілі вайну Нямеччыне, што ператварыла яе ў другую сусьветную. Польская армія змагалася, але ўжо 6 верасьня немцы ўзялі Кракаў, а 8 верасьня дасягнулі прадмесьцяў Варшавы. Праз тыдзень 35 польскіх дывізіяў былі ці разгромленыя, ці акружаныя ля Варшавы. 17 верасьня пасьля некалькіх дзён мужнай абароны было захопленае Берасьце зь берасьцейскай крэпасьцю разам.

Нягледзячы на бліскучую перамогу, Гітлер нэрваваўся, чаму Савецкі Саюз не ўступае, як дамоўлена, у вайну. Немцы выйшлі на заплянаваны рубеж і ў некаторых месцах нават перайшлі яго. Сталін і Молатаў марудзілі з пачаткам, бо не хацелі выглядаць у вольным сьвеце агрэсарамі. І Масква знайшла выдатнае выйсьце з той сытуацыі: дачакалася моманту, калі нямецкая армія дайшла да заходнебеларускіх і заходнеўкраінскіх земляў. Цяпер Савецкі Саюз меў «законную» падставу захопу часткі польскіх земляў, бо гэта была абарона беларускага й ўкраінскага насельніцтва. Міт быў створаны надзвычай удалы. Некаторыя артадаксальныя гісторыкі карыстаюцца ім і да гэтай пары.

17 верасьня пачаўся захоп Польшчы з усходу. Так, мясцовае насельніцтва сустракала савецкую армію кветкамі, але быў і супраціў, як напрыклад, баі з чырвонымі каля Горадні. 22 верасьня 1939 г. у Берасьці адбыўся сумесны парад нямецкіх і чырвоных войскаў. Па афіцыйных падліках, савецкія жаўнеры страцілі ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне 737 чалавек забітымі і 1862 параненымі (страты нацыстаў склалі ў Польшчы 10572 чалавекі забітымі, 30322 параненымі і 3400 прапала бязь вестак).

Пакуль войскі Савецкага Саюзу «вызвалялі» ўсходнія крэсы, у Маскве ішлі перамовы паміж Рыбэнтропам і Молатавым, якія скончыліся ноччу 28 верасьня «Савецка-нямецкай дамовай аб сяброўстве й мяжы». У дакумэнце цынічна сьцьвярджалася, што Нямеччына й СССР гарантуюць захопленай Польшчы мір і спакой. Падпісалі два пратаколы: паводле першага Савецкі Саюз у абмен на Літву аддаваў немцам землі на ўсход ад Варшавы, а таксама Люблінскую правінцыю, якія захапіла Нямеччына, нягледзячы на дамоўленасьць ад 23 жніўня. Другі пратакол быў караценькі: *«Абодва бакі не дапусьцяць на сваіх тэрыторыях ніякай польскай агітацыі, якая закранае інтарэсы другога боку. Абодва бакі абавязаныя: падаўляць на сваіх тэрыторыях любую агітацыю і інфармаваць адзін другога адносна прынятых з гэтай мэтай захадаў»*. Так адбыўся чацьверты падзел Рэчы Паспалітай, у выніку якога Савецкі Саюз атрымаў этнічныя беларускія землі разам зь Беластокам пад сваё крыло.

Цынічныя заявы пра «ўзьяднаньне» беларусаў пайшлі прахам 10 кастрычніка 1939 г., калі савецкі ўрад прыняў рашэньне перадаць Літве Вільню й Віленскі край. Гэта быў тактычны ход: у абмен Літва пагаджалася разьмясьціць савецкія вайсковыя базы на сваёй тэрыторыі. Улетку 1940 г. ёй былі перададзеныя яшчэ Гадуцішкаўскі й Сьвянцянскі раёны, а таксама часткі Астравецкага, Ашмянскага, Пастаўскага і Сьвірскага раёнаў.

А 22 кастрычніка 1939 г. прайшлі «чэсныя» і «дэмакратычныя» (безальтэрнатыўныя) выбары ў Народны Сход Заходняй Беларусі. Прагаласавала аж 96,8% выбаршчыкаў! Занадта многа, каб гэта нагадвала праўду. У Народны Сход, які пачаў працу 28 кастрычніка 1939 г. у Беластоку, былі абраныя 926 народных дэпутатаў. Наступнага дня Сход прыняў Дэкларацыю аб уключэньні Заходняй Беларусі ў склад БССР. Вярхоўны Савет СССР, а потым і Вярхоўны Савет БССР далі на гэта высокі «дазвол». ■



Заходняя Беларусь, Морач (Клеччына). Эх, музыкі, дайце жару...

Фотаздымкі Анатоля Клешчука

«ЗДАРОВА, ТАВАРЫШЫ,

Алег ГАРДЗІЕНКА

У другой Рэчы Паспалітай адчуваўся нацыянальны ўціск. Польская дзяржава надта дбала пра ўласную бясьпеку і перасьледавала некаторыя беларускія партыі кшталту Грамады і КПЗБ. У турмы саджалі пераважна камуністаў. Праўда, ніхто ня быў расстраляны й не было ГУЛАГу, у адрозьненьне ад СССР. Беларускі драматург Францішак Аляхновіч у сваіх мэмуарах «У капцюрох ГПУ» ўспамінаў, як яго абменьвалі ў 1933 г. на станцыі Негарэлае на Браніслава Тарашкевіча. Аляхновіча, пасьля сямі гадоў Салаўкоў, прывезьлі непаголенага, апранутага ў старую зношаную куфайку. А дастаўлены з гарадзенскай турмы Тарашкевіч быў у модным палітоне, прыгожым капелюшы. Так па-рознаму выглядалі вязьні дэмакратычных Саветаў і буржуазнай Польшчы.

Да «ўсходніх крэсаў» даходзіла моцная савецкая прапаганда. Людзі верылі, што ў Савецкай Беларусі іхныя браты жывуць больш заможна. Той, хто нелегальна пераходзіў мяжу на Ўсход у пошуках лепшай долі, назад, як правіла, не вяртаўся, так што не было каму распавесьці пра жорсткую праўду жыцьця ў «самай вольнай краіне». Можа, таму ў беларускіх вёсках і гарадох савецкае войска сустракалі з кветкамі. Максім Танк напісаў з гэткае нагоды верш «Здарова, таварышы, доўга чакалі...»

За Чырвонай Арміяй на землі заходніх беларусаў паехалі беларускія музыкі, пісьменьнікі, мастакі, галоўнай задачай якіх было распавядаць «вызваленым» ад палякаў, як добра жыць і працаваць у Савецкай Беларусі.

Кампазытар Мікола Шчаглоў успамінае пра такую сваю паездку разам зь Янкам Купалам: *«Пачалі паказвацца вёскі. Купала штурхнуў мяне ў бок, быццам гаворачы: «Бачыш, братку?» Я, ведама, бачыў. Вёскі былі прыгожыя, чыстыя. Хаты былі добра крытыя, з выразанымі, маляванымі аканіцамі, добра зашклёнымі вокнамі, зь вясёлымі гародчыкамі, поўнымі пышных вяргіняў і мальваў. Усё гэта было так не падобнае да бедных, шэрых калгасных вёсак савецкае зямлі, што не заўважыць розьніцы было немагчыма».*

У Стоўпцах яны спыніліся ў настаўніка гімназіі, які меў кватэру ў некалькі пакояў. *«Мы распытвалі гаспадароў пра іхнае жыцьцё, яны пыталіся ў нас пра нашае. Гаспадар прызнаўся, што ён зарабляў каля 400 злотых і што, адлічыўшы ўсе выдаткі на кватэру і пражыцьцё, у яго заставалася каля 150 злотых у месяц. Грошы гэтыя складваліся, а ўлетку яны з жонкай езьдзілі ў*

Заходняя Беларусь, Давыд-Гарадок (Століншчына), крыж убіраюць кветкамі на Макавея

НЕАКТУАЛЬНАЯ

Сяргей ХАРЭЎСКІ

Падзеі верасьня 1939-га ў гісторыі нашага мастацтва займаюць вузка акрэсьленае месца. Пасьля хвалі жывапісных і графічных твораў, зробленых да 1941 году, ніхто не вяртаўся да гэтае тэмы ў паваенны час. Нягледзячы на чырвоную дату «17 верасьня» ў беларускіх календарах, пра яе мала хто згадваў. А новае пакаленьне беларусаў мала што пра гэта і ведала...

Пару радкоў у савецкіх падручніках мала што прасьвятлялі. Аднак праўда пра той год вытыркалася ў паўсядзённым беларускім жыцьці. Памятаю, у кватэры аднаклясьніка я засьпеў госьця — калярытнага дзеда з даўжэзнымі чорна-сарэбнымі вусамі, па-ўланску закручанымі ўгору. Стары вайсковы дзедаў фрэнч справакаваў мяне на пытаньне: «Дзядуля, а вы ваявалі?» – «Вядома! Як і ўсе... Ахоўвалі тэлеграфныя лініі, каб бандыты дратоў не парэзалі» – «Якія такія бандыты?» — запытаўся я. «Якія? Маскоўскія, халера на іх...» — быў адказ. Я аслупянеў. Як патлумачыў пазьней аднаклясьнік, ягоны дзед і насамрэч быў уланам у Войску Польскім, адседзеў у лягерах, пасьля недзе быў у Іране, Італіі... У маёй галаве менскага школьніка ўсе веды па гісторыі БССР паступова ператвараліся ў кашу.

Як ні парываўся я ў школе, а пазьней і ў мастацкай вучэльні намаляваць што-небудзь на гэты сюжэт, настаўнікі мякка, але катэгарычна адгаворвалі. Беларускія ж мастакі, не пасьпяваючы адсачыць чарговы выгіб лініі партыі, наогул адклалі гэтую тэму ўбок. А створанае перад вайною патанула ў музэйных сховах. Найперш таму, што ў большасьці тых твораў былі выяўленыя Вільня й Беласток, якія па вайне апынуліся за нашымі межамі. Каб не вярэдзіць нацыянальную сьведамасьць, на іх мусілі забывацца. Ды й Польшча стала па вайне братняй краінаю. Згадваць былыя звады было некарэктна. Ды і асобы, выяўленыя на тых палотнах, прапалі. Трэ было забыцца і пра іх.

Адзін з найбольш адметных тых твораў — «Сустрэча савецкіх танкістаў у Беластоку. 1939 год» Манасзона, які цяпер у каталёгах завецца сьціплей — «Сустрэча з танкістамі». Шмат людзкіх тыпажоў, якія слухаюць танкіста-балагура. Куток старога гораду. Дахоўка. Брук. Першапачаткова, праўда, ён пісаў Вільню, але давялося крыху перапісаць і перайменаваць, каб выставіць у 40-м у Маскве. На той жа маскоўскай Усесаюзнай выставе «Нашы дасягненьні» было выстаўленае і яшчэ адно палатно Манасзона —

ДОЎГА ЧАКАЛІ?»

горы ці на мора адпачыць... У нас настаўнікі таксама атрымоўвалі па 400—500 рублёў, але хапала ім зь сям'ёй адно на хлеб ды бульбу».

Такім пабачылі жыцьцё «гаротных» беларусаў прышэльцы з Саюзу. А за агітатарамі прыйшла новая адміністрацыя, якая стала заводзіць новыя парадкі: пачаліся мітынгі зь іхнай бясконцай балбатнёй, пошукі «ворагаў». Алесь Алехнік, дзяяч беларускай дыяспары ў Аўстраліі, які тады быў дзесяцігадовым юнаком, згадвае: *«Тады ж пачуліся й першыя «апраўданьні» камуністаў за іхныя няўдачы й няўмельства ў гаспадараньні ў Заходняй Беларусі. Самым распаўсюджаным апраўданьнем была «засуха», і я сам чуў, як палітрук аднойчы сказаў маме: «Вот чёрт побери, куда б мы ни пришли — везде начинается засуха!»*.

Але, напэўна, самае парадаксальнае сьведчаньне прыводзіць у сваіх успамінах Барыс Рагуля, удзельнік беларускага нацыянальнага руху часоў нямецкай акупацыі й дзяяч эміграцыі. Ён служыў у польскім войску і ўдзельнічаў у польска-нямецкай вайне 1939 г. Апынуўшыся ў палоне, уцёк і перайшоў мяжу з Савецкім Саюзам. Калі з таварышам дайшоў да першай хаты на савецкім баку, дык спужаны гаспадар запытаўся, хто яны такія. *«Мы адказалі, што ваеннапалонныя,* — згадвае Рагуля, — *уцяклі ад немцаў і толькі толькі апынуліся на радзіме... Селянін паглядзеў на нас і сказаў: **«Дурні! Вяртайцеся да немцаў і прыходзьце разам зь імі, каб вызваліць нас!»** ...Ён дадаў, што мы зрабілі найвялікшую памылку, калі ўцяклі ў Савецкі Саюз»*.

Новая савецкая ўлада, забраўшы беларускую зямлю, пачала ўсталёўваць свае законы: амаль адразу аддала Вільню літоўцам, узялася ствараць калгасы. Пачаліся арышты заможных сялянаў, асаднікаў, паноў, чыноўнікаў, якія служылі польскай уладзе. Пацягнуліся эшалёны, у якіх людзей, як быдла, вывозілі на ўсход. Пачаліся шырокія арышты сярод інтэлігенцыі. Выразалі ўсіх тых, хто так ці йнакш не падзяляў камуністычныя погляды. Некалькі тысячаў жаўнераў і афіцэраў польскага войска знайшлі свой вечны прытулак у лясох пад Катыньню.

Заходняя Беларусь, Мядзел, кармэліт бласлаўляе

Большасьць насельніцтва цярпліва зносіла пакуты, іншыя супраціўляліся. Людзі чагосьці чакалі, ненавідзячы новую ўладу... Можа таму ў чэрвені 1941 г., як і ў верасьні 1939 г., выходзілі з кветкамі й хлебам-сольлю, толькі цяпер яны ўжо сустракалі немцаў, спадзеючыся, што горш, чым пры Саветах, ніколі ня будзе. Беларусы ў чарговы раз памыліліся... ■

Заходняя Беларусь, Буйвідзішкі (Браслаўшчына), апошні старавер, а за ім — стараверская царкоўка

З АГНЮ ДЫ Ў ПОЛЫМЯ

Карэспандэнт «НН» спытаўся ў аўтарытэтных людзей Гарадзеншчыны, якім яны бачаць тое ўзьяднаньне 17 верасьня 1939 году ў люстэрку сёньняшняга дня.

Беларускі этнас стаў адзіны

Алесь Астроўскі, прафэсар Гарадзенскага мэдінстытуту:

«Аб'яднаньне злучыла дзьве часткі аднаго беларускага этнасу на яго геаграфічнай прасторы. На жаль, ня ўсёй. Іншая справа, якім чынам адбывалася тое «ўзбуйненьне» Беларусі. Урэшце, пасьля Рыскай мірнай дамовы 1921 году кожны адукаваны беларус разумеў, што ні польская, ні бальшавіцкая ўлады — не ягоныя. Беларусаў не запрашалі ў Рыгу. Таму й дамова Расеі і Польшчы для беларусаў ня мела ніякай юрыдычнай сілы. Ці пугай, ці бізуном, а баліць аднолькава. Першыя душылі ў Сібіры, другія ў Картуз-Бярозе ці Вронках. І тыя, і тыя імкнуліся падарваць беларускі генафонд, расьсейваючы яго на прасторах Расеі ці Польшчы.

Але заходняму беларусу пашчасьціла больш, чым яго ўсходняму брату. За 18 гадоў улады Рэчы Паспалітай судом да пакараньня сьмерцю прыгаварылі каля 300 актывістаў камуністычнага руху, сярод іх ня так шмат беларусаў. У савецкіх лягерах загінулі сотні тысяч беларусаў.

Што да адрозьненьняў, дык гарадзенскі акадэмік Юры Астроўскі з апорай на біялягічныя дасьледаваньні давёў, што жыхары заходняй і ўсходняй Беларусі нічым не адрозьніваюцца».

Пасьля надышло ацьверазеньне

Сямён Домаш, сябра Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету, старшыня «Гарадзенскай ініцыятывы»:

«Адзін народ — адна краіна. У гэтым сэнсе аб'яднаньне Заходняй Беларусі з БССР аб'ектыўна справядлівае. Але дасланыя партыйна-савецкія і гаспадарчыя кадры прынесьлі з сабой і сталінскія мэтады кіраваньня. Недавер да мясцовага насельніцтва даходзіў да абсурду. Да 1941 году ў КП(б)Б было адноўлена толькі 17 чалавек з разагнанай Сталіным КПЗБ. Нават нацыянальны герой Беларусі Сяргей Прытыцкі, намесьнік старшыні Беластоцкага аблвыканкаму, быў прыняты ў партыю паводле спэцыяльнага рашэньня бюро кампартыі рэспублікі. Што тады казаць пра шараговых камуністаў?

Нельга нічым апраўдаць рэпрэсіі. НКВД выконваў інструкцыю Панамарэнкі: пазбавіць волі ўсіх памешчыкаў і паліцэйскіх. Разам з гэтай катэгорыяй людзей былі высланыя дзясяткі тысяч абсалютна невінаватых грамадзян польскай нацыянальнасьці. Адгалосак нэгатыўнага стаўленьня да палякаў адчуваецца й сёньня.

18-гадовае жыцьцё «пад Польшчай», адсутнасьць калгаснай сыстэмы, прага зямлі, умельне працаваць захавалі ў характары заходняга беларуса пачуцьцё гаспадара. Зусім невыпадкова Гарадзеншчына сёньня — эканамічна найбольш моцная вобласьць. Не да нас трэба прысылаць на кіраўнічыя пасады магілёўскіх аграрных спэцыялістаў, а наадварот, ураджэнцы Заходняй Беларусі павінны ўзначаліць рух за палітычнае і сацыяльна-эканамічнае адраджэньне Беларусі».

Дух вольнасьці сілкаваў таленты

Аляксей Пяткевіч, прафэсар Гарадзенскага ўнівэрсытэту:

«Адназначна ўхваляю сам факт узьяднаньня Заходняй Беларусі з усходнімі землямі. Але не ўспрымаю агрэсіўных бальшавіцкіх мэтадаў, з дапамогай якіх тутэйшых жыхароў заганялі ў сацыялізм. Добра сказаў наш славуты Алесь Белакоз: патрапілі з агню ды ў полымя. Асабліва гэта адбілася на творчасьці заходнебеларускіх літаратараў. Аднак нават найбольш збальшавізаваныя Максім Танк і Піліп Пестрак, і тыя захавалі мэнталітэт заходняга беларуса. Гэта яскрава праявілася ў вершах Танка. Або такі факт: Піліп Пестрак падтрымліваў трывалыя сувязі з эмігрантам Сяргеем Сіняком. Гэта стала вядома толькі пасьля сьмерці аўтара раманаў «Сустрэнемся на барыкадах», «Серадзібор». Вось вам і пясьняр Савецкай Беларусі! Валянцін Таўлай (пра гэта сьведчыў Уладзімер Калесьнік), працуючы ў 1945 годзе ў музэі Янкі Купалы, на свае страх і рызыку пакрыху перавозіў зь Вільні з разрабаванага беларускага музэю творы, фотаздымкі і рэчы заходнебеларускіх аўтараў, так званых ворагаў народу, і прыхоўваў «да лепшых часоў». Гэта сьведчыць пра тое, што паэты і пісьменьнікі Заходняй Беларусі, якія аддавалі перавагу мэтаду сацыялістычнага рэалізму, увачавідкі пераканаліся ў сваёй памылцы ва ўспрыняцьці савецкай улады. Тое, што бачылася здалёк прыгожым і прывабліым, насамрэч аказалася жахлівай рэчаіснасьцю. Але сілы для адкрытага змаганьня з новым ворагам не знайшлося».

СССР зьдзейсьніў агрэсію

Віктар Шалкевіч, бард:

«17 верасьня 1939 году Савецкі Саюз нанёс Польшчы ўдар у сьпіну. Пра якое вызваленьне і аб'яднаньне можна казаць, ведаючы пра патаемны зговар Сталіна й Гітлера? Быў звычайны падзел драпежнікамі захопленых тэрыторыяў. А на радасьцях фашысты й камуністы ў Берасьці і Львове наладзілі сумесныя вайсковыя парады. Ці гэта ня доказ сапраўдных мэтаў паходу Чырвонай Арміі, «вызваленьня адзінакроўных братоў-беларусаў і братоў-украінцаў»?

Мая маці была сьведкаю тых жахлівых падзеяў. Неаднойчы распавядала мне, як вывозілі вяскоўцаў «на Сібір». Гэта было ў сьнежні 1939 — студзені–лютым 1940 году. Амаль голых людзей выкідвалі з хаты. І цягнуліся тыя конныя абозы ў страшныя маразы да чыгунак. Нешта не чуваць было, каб сяляне масава вярталіся пасьля да родных котлішчаў. А беларуская і польская «партызанка» хіба ня там мае свае карані? Пасьля такой несправядлівасьці і зьдзеку міжволі ўхопіся за зброю. У Заходняй Беларусі вялася сапраўдная грамадзянская вайна. Нават пасьля 1945 году адзелы Арміі Краёвай і беларускіх патрыётаў не скарыліся Саветам.

Кожны бачыць у даце 17 верасьня 1939 году тое, што хоча пабачыць. А я стаю на сваім — далучэньне адбылося шляхам захопніцкай агрэсіі. Вызваленьне!.. Тое самае, што калі б Беларусь узяла й заатакавала Злучаныя Штаты, лямантуючы пры гэтам аб бядачай долі братоў-беларусаў, што атабарыліся ў ЗША. Між іншым, вызваляць Заходнюю Беларусь Чырвоную Армію ніхто ня клікаў. Здаецца, такая думка Сталіну прыйшла ў галаву толькі ў жніўні 1939 году, калі на парадку дня ўстаў перадзел Эўропы».

Апытваў Антон Лабовіч

Заходняя Беларусь, Лагішын (Піншчына), скупляюць агуркі

Заходняя Беларусь, баптысты, хрышчэньне на Гарыні

ТЭМА

«Зьнянацку», якое ілюстравала дзейнасьць партызанаў супраць польскіх жаўнераў. А побач у той экспазыцыі віселі «Народны сход Заходняе Беларусі ў Беластоку» Мадорава, «Беласток — савецкі» Давідовіча і Ціхановіча, «Белапалякі гаспадараць» Рана, «Раззбраеньне польскага атрада» Бржазоўскага, «Арышт савецкіх агітатараў» Андруховіча ды яшчэ тузін палотнаў на падобныя тэматы.

Сярод іх хіба толькі карціна Мазалёва, тады яшчэ зусім маладога мастака, «Горадня. 1939 год», засталася ў аналах беларускага жывапісу. На палатне — гарадзкі пэйзаж. Прыбяры дату — і нічога не застанецца ад верасьнёўскае драмы.

Было на той выставе перад савецка-нямецкай вайною і багата графічных твораў. Толькі зь Беластоку выстаўляліся тады Краеўскі, Хршчаноўскі, Малярэвіч ды Тыбер. Але найбольшы посьпех мела сэрыя графіка Гэмбіцкага, прысьвечаная вайне з Польшчаю. Калі я цяпер гляджу на ягоныя дрэварыты, скажам, на аркуш «Рэжуць драты», дык згадваю міжволі дзеда свайго аднаклясьніка. Таго самага ўлана, які сьцярог тыя драты й патрапіў за гэта ў выгнаньне. Туды ж патрапіў і мастак Гэмбіцкі, рэпрэсаваны перад самай вайною. А дзясяткі палотнаў ды малюнкаў, якія адлюстравалі верасень 39-га, патрапілі ў запасьнікі, разам з самой тэмаю... ■

Ібрагім Гэмбіцкі. «Разгром сялянамі польскіх акупантаў», 1939

БЕЛАРУСЫ ЗАХОПЛЕНЫЯ ЗАХОДНІМ ЛАДАМ, АЛЕ

«Што думаюць пра нас іншыя» — такім пытаньнем задалася польская газэта «Rzeczypospolita». Ці зьмяніўся вобраз Польшчы і палякаў за апошнія 10 гадоў вызначальных пераменаў у ладзе і гаспадарцы краіны? У цыклі «Як нас бачаць і пішуць» ужо апублікаваныя матэрыялы ўласных карэспандэнтаў газэты з ЗША і Канады, Нямеччыны і Англіі, Расеі і Літвы, Італіі і Швэцыі, Чэхіі і Ўкраіны, Аўстрыі, Францыі і Вугоршчыны. Нарэшце чарга дайшла і да беларусаў. У матэрыяле Ежы Гашчынскага гутарка ідзе пра тое, які вобраз палякаў і Польшчы існуе сёньня ў нас. Ці варта дадаваць, што малюючы вобраз палякаў і Польшчы, беларусы найперш ствараліе вобраз сваёй нацыі і сваёй краіны.

Ч вэрць веку таму, калі я яшчэ быў бальшавіком, значная частка польскай палітычнай і навуковай эліты думала пра Беларусь як пра ўсходнія крэсы. Цяпер палякі ведаюць, што іхнай краіне патрэбная незалежная Беларусь. За дваццаць пяць гадоў адбыліся станоўчыя зьмены. Я перастаў быць бальшавіком, а польская эліта перастала глядзець на Беларусь як на крэсы, — кажа Станіслаў Шушкевіч, сёньня адзін зь лідэраў апазыцыі.

У нейкім сэнсе Польшча для беларускай апазыцыі сёньня — тое самае, што ў васьмідзясятыя гады для «Салідарнасьці» былі заходнія краіны. Не ў такой, праўда, вялікай колькасьці, бо ў Польшчу эміграваля дзеля палітыкі сама болей некалькі дзясяткаў беларусаў.

Ёсьць і яшчэ адна істотная розьніца — грамадзяне Беларусі могуць безь перашкодаў перасякаць польскую мяжу, дастаткова даступнага паўсюль і таннага ваўчара. Дзякуючы гэтаму апазыцыянэры альбо людзі зь незалежнымі поглядамі могуць прыяжджаць у нашу краіну, каб — як сказаў адзін зь іх — «запраўіць акумулятары», адчуць сябе вольным. Робяць яны гэта часта — у тым ліку і Станіслаў Шушкевіч. У сваю чаргу, дзеячы БНФ наносяць візыты свайму правадыру Зянону Пазьняку.

— Для беларускай палітычнай эміграцыі Польшча — найлепшая краіна. З усіх эўрапейскіх дзяржаваў, акрамя тых, што належалі да СССР, найлепей беларускую сытуацыю разумее менавіта Польшча. Палякі самі былі пад расейскай акупацыяй і ведаюць, што значыць маскоўская палітыка, — кажа Пазьняк, які мае ў Польшчы від на жыхарства.

У 1996 годзе, баючыся за сваё жыцьцё, ён выехаў у ЗША, дзе атрымаў палітычны прыстанак. А ягоныя жонка і дачка падобны статус атрымалі ў Польшчы. Тут урэшце асеў і сам Зянон Пазьняк.

— Адсюль блізка да Беларусі, — кажа ён, — межы празрыстыя, можна падтрымліваць кантакты з калегамі ў апазыцыі, і мова падобная, псыхалягічна лягчэй, асабліва таму, што адчуваю падтрымку. Калі ў 1996 годзе зацікаўленьне Беларусяй было вельмі вялікае і я выступаў у польскай тэлевізіі, дык потым на вуліцах у Гданьску ці Варшаве, нават у трамваі, людзі выказвалі мне сваю сымпатыю, салідарнасьць.

Падазроныя сваякі добрай настаўніцы

— У савецкай прапагандзе ў Беларусі палякі адыгрывалі нэгатыўную ролю. Гаварылася пра «польскіх паноў», падкрэсьлівалася іхная чужасьць, імі настрашвалі і адначасова іх жа высьмейвалі. І такі стэрэатып яшчэ існуе, хоць, зразумела, не сярод арыентаванай на захад інтэлігенцыі, — кажа Лявон Баршчэўскі, намесьнік дырэктара Беларускага Гуманітарнага Ліцэю і адзін зь лідэраў БНФ.

Як прыклад такой прапаганды, Баршчэўскі згадвае твор Янкі Брыля «Сірочы хлеб». Там ёсьць вельмі станоўчы пэрсанаж — польская настаўніца. Але каб магчы нешта такое апублікаваць, Брыль мусіў увесьці ў твор некалькі іншых палякаў, адмоўных і падазроных.

На думку Зянона Пазьняка, «у савецкай Беларусі рэалізоўвалася маскоўская палітыка ў дачыненьні да Польшчы. ПНР афіцыйна была братняй краінай. Прынамсі вонкава гэта выглядала на дружбу. Камуністычная прапаганда асабліва палякаў ня біла. Паводле



Фота Кжыштофа Мілера

яе, нармальным чалавекам быў той, у каго нічога не было, а іншыя — абшарнікі, капіталісты, але неабавязкова палякі — былі дрэннымі.

— Доўгія гады ў савецкай прэсе ў Беларусі Польшча была па-за ўсялякай крытыкай, — кажа Павал Якубовіч, галоўны рэдактар «Советской Белоруссии», органу адміністрацыі прэзыдэнта.

Пашана і няпрыязь

«Польскасьць — тое самае што панскасьць. Мы прагнем яе і баімся адначасова», — пісаў некалі Сакрат Яновіч, найбольш вядомы беларускі пісьменьнік, які жыве ў Польшчы.

— Сёньня гэта ўсё менш актуальна і датычыць майго пакаленьня, — кажа 63-гадовы Яновіч. — Маладое пакаленьне той панскасьці не баіцца, ну, хіба трохі. Гэта вынікае зь лёгікі гісторыі. Палякі ў Беларусі — гэта заўсёды была «дыяспара» — альбо горад, альбо маёнтак і ніколі — вёска. Вось чаму ўтварыўся стэрэатып, што беларус — гэта селянін, а паляк — пан у маёнтку альбо месьціч. Гэта стэяны гэтаксама, як той паляк, ходзяць у джынсах.

— Аднак у Беларусі гэта яшчэ мае значэньне, — дадае Яновіч. — Зьвярніце ўвагу, зь якой пашанай і адначасова няпрыязю беларусы, якія гандлююць у Польшчы, вымаўляюць слова «пан». Здавалася б, яны павінны на сваёй мове казаць «спадар» ці па-расейску «гаспадін», а яны — не, паслугоўваюцца словам «пан», якое, між іншым, турэцкага паходжаньня. Яны кажуць так, каб падкрэсьліць, што размаўляюць з палякам. І гэта ў іхнай расейскай мове гучыць сьмешна. Вельмі цікавая гэтая эмацыйная афарбоўка, зь якой на базары вымаўляецца «пан». «Слушай, пан!» — гэта ж кабарэ!

Польская вера

— Я беларус польскай веры, — так прадстаўляецца шмат каталікоў у розных рэгіёнах Беларусі, таксама і на ўсходзе краіны, які да II сусьветнай вайны не належаў Польшчы.

— Я гавару зь селянінам па-беларуску, а ён кажа: як пан добра гаворыць па-польску, — нярвуецца Зянон Пазьняк. — Ён застаўся ў мінуўшчыне, яму здаецца, што калі нехта ходзіць у касьцёл, дык ён паляк.

— Сёньня працягваюць памылкова злучаць каталіцызм і польскасьць, — падкрэсьлівае прафэсар Адам Мальдзіс, дырэктар Нацыянальнага Цэнтру імя Францішка Скарыны. — Але насамрэч каталік неабавязкова мусіць быць з польскай сям'і. Забываецца тое, што ў 30-я гады XIX ст., калі скасавалі Вунію, каля мільёну ўніятаў, гэта значыць беларусаў, перайшлі не ў праваслаўе, а ў каталіцызм. Адтуль цяперашнія беларусы каталікі.

Прафэсар Леанід Лойка, гісторык з БДУ, успамінае, як яшчэ ў 50-я гады ў добра вядомай яму вёсцы Сакоўка, 40 км на ўсход ад Менску, жыхары на працягу ўсяго году былі беларусамі:

— Толькі перад Божым Нараджэньнем вёска падзялялася на палякаў, гэта значыць каталікоў, і рускіх, або праваслаўных.

— У некаторых месцах і надалей беларуская мова ўважаецца за штодзённую, а польская — за вышэйшую, сьвяточную. Так адбываецца ў старых засьценках, дзе жыла пераважна шляхта, — кажа прафэсар Мальдзіс, прыводзячы ў прыклад вёску Кемелішкі і ваколіцаў Быстрыцы з свайго роднага Астравецкага раёну (на паўночны захад ад Менску, у кірунку Вільні). — Што цікава, ксяндзы палякі прамаўляюць казань па-польску пераважна ў тых вёсках, дзе жыве беларускае насельніцтва, тады як у вёсках, дзе насельніцтва часьцей ужывае польскую мову, ёсьць ксяндзы, якія па-польску добра ня ўмеюць. Ня ведаю, ці гэта выпадкова.

Літанія і квіток у кіно

Перакананьне пра тое, што каталіцызм зьвязаны з польскасьцю, калі-нікалі выкарыстоўваюць прыхільнікі блізкай інтэграцыі з Масквой. Некалькі месяцаў таму газэта «Славянский Набат» (выданьне найбуйнейшага менскага рынку) пераконвала, што палякі і каталікі ў заходняй Беларусі могуць пачаць змагацца за аўтаномію, што пагражае паўтарэньнем Косава.

— Лукашэнка абвяшчае, што апазыцыянэры маюць польскія карані і думаюць пра аўтаномію, — кажа Зянон Пазьняк. — Я, паводле яго, таксама паляк, як і Шушкевіч, і ўсе каталікі. Гэта глупства яшчэ з савецкіх часоў, разьлічанае на людзей забітых і неадукаваных.

Пра Станіслава Шушкевіча і некаторыя польскія крыніцы пішуць, што ён сын полькі.

— Мая маці і мой бацька былі беларусамі, — папраўляе былы старшыня Вярхоўнага Савету. — Маці была каталічкай, таксама як і бабка па кудзелі, якая малілася па-польску, але размаўляла па-беларуску.

Ад бабкі Шушкевіч навучыўся маліцца па-польску.

— Яна заахвочвала мяне такім чынам, што калі я авалодваў якой-небудзь літаніяй ці малітвай, дык давала мне грошы на кіно.

«Наша савецкая» гарчыца

— Польшча для нас прыклад, які паказвае, што можна не глядзець, што там было колькі гадоў назад, і хто быў кім, бо нейкія абвінавачаньні заўсёды можна выставіць каму заўгодна, — кажа Шушкевіч, паводле адукацыі ядзерны фізык. Ён 25 гадоў падтрымлівае кантакты з Польшчай, у 70-я працаваў як выкладчык у Ягелонскім унівэрсытэце.

— Я наведваў Польшчу шмат разоў, таксама ў тыя часы, калі ў крамах не было нічога, апроч воцату і хлеба. Палітыкай авалодваў ня з кніг, а з таго, што рабілася ў Польшчы.

Шушкевіч падкрэсьлівае, што ніколі ня ставіўся да Польшчы непаважліва. У адрозьненьне ад тых дэпутатаў колішняга Вярхоўнага Савету, якія — «чаго лепш ня згадваць» — яшчэ зусім нядаўна лічылі, што ўсё дабро для Беларусі прыходзіць з Расеі, а ўсё зло — з Польшчы.

— Яны былі дэзарыентаваныя. Ня мелі ведаў. Пазьней зразумелі, што памыляліся.

Сярод тых, што памыляліся, быў адзін зь лідэраў апазыцыі, які сёньня актыўна шукае ў Польшчы падтрымкі, а яшчэ некалькі гадоў таму крытыкаваў у Вярхоўным Савеце Польшчу за шматвяковую «панскую» палітыку прыгнёту беларусаў. Іншы, відны сёньня апазыцыянэр, патрабаваў у парлямэнцкім буфэце «нашай савецкай» гарчыцы замест польскага «лайна», якое там падавалі.

Пах кавы і сасіскаў

— Я ў Польшчы ніколі не была, але мая сяброўка часта езьдзіць. І кажа, увесь час чуе пах кавы з варшаўскіх кавярняў. Уяўляю, што ў вас усё так каляровa і багата, — распавядала мне летась прадаўшчыца ў калхознай крамцы, 30 км на поўнач ад Менску, куды з базы трапляе, у лепшым выпадку, грузінская гарбата.

Сюжэт пра поўныя польскія крамы зьяўляецца ў расповедах беларусаў вельмі часта. Нічога дзіўнага, бо шмат іх прыяжджае ў Польшчу на закупкі. Некалькі месяцаў таму на працягу аднаго дня я спаткаў у Варшаве на закупках трох беларускіх журналістаў з розных рэдакцыяў. Яны прыехалі па адзеньне: адзін прымяраў штаны ў гандлёвым цэнтры, другі аглядаў плашчы, а трэці кружляў каля кашуляў у краме на Маршалкоўскай.

Алена Стралкова, 32-гадовая публіцыстка і гісторык, першы раз была ў Польшчы пяць гадоў таму. Ужо тады забесьпячэньне зрабіла на яе вялікае ўражаньне:

— Я хацела купіць чакаляду з арэхамі, а прадаўшчыца пытаецца — каторую, бо іх было пяць відаў.

Станоўча пра новыя крамы і пра піва, «добрае, халоднае і ў вялікіх колькасьцях», распавядае Міхал Бацян, дарадца беларускага пасольства ў Варшаве.

ДЛЯ СЯБЕ ВЫБІРАЮЦЬ САВЕЦКІ

Праўда, ён лічыць, што смак прадуктаў пагаршаецца:

— У 80-я гады я працаваў у Варшаве карэспандэнтам «Комсомольской правды». Тады яшчэ былі карткі на мяса, а мы з жонкай куплялі сасіскі ў краме для замежнікаў. Пах тых сасісак я памятаю да сёньня. Цяпер яны горшыя. Хоць якасьць каўбасаў у Польшчы і так лепшая, чым на Захадзе, што я ведаю з уласнага досьведу, бо тры гады працаваў у Аўстрыі.

На думку Бацяна, у параўнаньні з 80-мі гадамі ў Польшчы адбылося шмат зьменаў у звычаях і мэнтальнасьці:

— Стала меней п'яных людзей, як іду дадому, дык добра, калі аднаго пабачу, а некалі іх было болей. Людзі цяпер дбаюць аб працы, хочуць зарабіць. Асабліва мне падабаецца моладзь, найперш студэнцкая, яе прага ведаў.

Лявон Баршчэўскі, лідэр БНФ, у Польшчы пачуваўся добра нават у першай палове 80-х, адразу пасьля вайсковага становішча. Тады яму было 25 гадоў і ён выступіў як канфэранс у беларускай праграме на Фэстывалі Савецкай Песьні ў Зялёнай Гуры.

— Ведаю, які гэта быў час для Польшчы, але для мяне і маіх знаёмых гэта і так было свабодай, — успамінае ён.

Рэкеціры з Заходняга вакзалу

Бывалыя беларусы прыяжджаюць у Польшчу з асьцярогай. Яны баяцца нападаў і разбояў на дарогах, рынках, што часта — як прызнае дарадца Бацян — учыняюць іншыя прыбышы з усходу.

Шмат хто пераканаўся, што польская паліцыя не бярэ да галавы злачынствы, у якіх ахвяры і выканаўцы — грамадзяне краін былога Савецкага Саюзу. У беларусаў нарастае перакананьне, што злачынцы з усходу вельмі добра пачуваюцца ў Польшчы, а іхныя ахвяры ня могуць разьлічваць на якую-небудзь дапамогу.

— Злую славу мае Заходні вакзал у Варшаве, дзе гарцуюць рэкеціры з усходу. Яны патрабуюць па 50 даляраў ад чалавека, — распавядае Алена Стралкова.

Пра такія дрэнныя бакі знаходжаньня ў Польшчы піша беларуская прэса.

На старонках «Советской Белоруссии», найбуйнейшай газэты, рэдка зьяўляюцца тэксты пра здарэньні ў Польшчы, бо газэта ня мае ў нас свайго карэспандэнта.

— Апошнім часам мы пісалі пра пратэсты работнікаў абаронай прамысловасьці, — кажа галоўны рэдактар Павал Якубовіч.

Некалькі месяцаў таму шмат месца ў прэсе займала тэма ўступленьня Польшчы ў NATO.

— Альянс наблізіўся да нашых межаў, мы баяліся, што гэта можа стаць пагрозаю для Беларусі або для Саюзу Беларусі і Расеі. — кажа ён. — Пераважала аднак перакананьне, што палякі маюць права выбіраць сабе лёс, што гэта іх уласная справа. Зрэшты, гэтая тэма ўжо згасла.

Спрэчнае дваццацігодзьдзе

Мне даводзілася сустракаць у Беларусі людзей, якія выказвалі шкадаваньне, што Юзэф Пілсудзкі не далучыў да Польшчы большай часткі беларускіх земляў. Яны меркавалі, што гэта абараніла б шмат вёсак ад калхознага мысьленьня, што не было б сёньня столькі ні на што ня здатных, несамастойных людзей. Да сёньня відаць розьніцу ў падыходзе да гаспадаркі, да зямлі і да ўласнага падворку паміж больш прадпрымальнай і багатай заходняй часткай Беларусі, якая ў міжваенны пэрыяд належала да II Рэчы Паспалітай, і ўсходняй, на той час савецкай.

Для іншых палітыкаў тыя гады ў Польшчы былі найчарнейшым пэрыядам для беларусаў. Зянон Пазьняк сьцьвярджае, што тагачасная Польшча праводзіла найгоршую палітыку ў дачыненьні да беларусаў.

— Дэпутаты адкрыта заяўлялі ў Сэйме, што беларусаў трэба палянізаваць. Старыя людзі гэта памятаюць.

Прафэсар Лойка кажа, што на тэму II Рэчы Паспалітай гісторыкі ў Беларусі дагэтуль фармуюць свой погляд:

— Нядаўна мы параўналі, як жылося ў міжваенным часе ў савецкай Беларусі і ў Польшчы. У лягеры ў Сыбіры трапіла шматразова болей беларусаў, чым у польскія турмы. Эканамічна таксама ў Польшчы ім было лепей, чым у СССР. На карысьць савецкай Беларусі сьведчаць культурныя справы. Аднак для поўнай ацэнкі нам увесь час бракуе матэрыялаў.

Зянон Пазьняк падкрэсьлівае, што цяпер «зьнікла праблема, якая існавала здаўна, асабліва ў міжваенны пэрыяд», гэта праблема польскае пагрозы для Беларусі, для яе незалежнасьці. Доказ яе неактуальнасьці, лічыць старшыня БНФ, — гэта ўступленьне Польшчы ў NATO і перайманьне ёю эўрапейскіх каштоўнасьцяў.

Пазьняк належыць да той групы беларускіх палітыкаў, якія — як гэта выказаў цытаваны раней Станіслаў Шушкевіч, — яшчэ некалькі гадоў таму ставіліся да Польшчы зь недаверам. У 1994 годзе шмат сумятні выклікаў ягоны артыкул у «Народнай Газеце», у якім многія ўбачылі тэрытарыяльныя прэтэнзіі да Польшчы, Расеі і Літвы.

— Няма ніякіх прэтэнзіяў, гэта маніпуляцыя, а маніпуляваў заўсёды КГБ, — закрывае пытаньне пра свой тэкст Пазьняк.

Шляхта пайшла за каралём

Менш эмоцыяў, чым гісторыя апошніх сямідзесяці гадоў, выклікае даўнейшая, з часоў I Рэчы Паспалітай. У гэтай галіне беларусам цяжэй дамовіцца зь літоўцамі, чым з палякамі. Спрэчка ідзе пра тое, кім былі стваральнікі Вялікага Княства Літоўскага.

— Вялікія роды, Радзівілаў або Сапегаў, мы лічым беларускімі, — кажа прафэсар Лойка. — Ясна, што яны не былі польскімі. Літоўскімі? Не, бо даўнейшая Літва — гэта сёньняшняя Беларусь, а даўнейшыя ліцьвіны — гэта сёньняшнія беларусы.

Дэнацыяналізацыя і палянізацыя вялікіх беларускіх радоў — балючая для беларусаў тэма.

— Аднак шляхта сама пайшла за сваім каралём, найперш у Кракаў, а пасьля і ў Варшаву. Віны Польшчы ў гэтым няма, — падкрэсьлівае Леанід Лойка.

Яшчэ сёньня ў кнігарнях Менску можна набыць выдадзеныя некалькі гадоў таму кніжкі, у якіх такія постаці як Станіслаў Манюшка ці Тадэвуш Касьцюшка прадстаўленыя як беларусы.

— Гэта эфэкт нацыянальнага адраджэньня. На ягонай хвалі пэўныя факты перабольшваюцца ці неўласьціва інтэрпрэтуюцца. Некаторыя імкнуліся такім чынам перамагчы свой комплекс ніжэйшасьці. Тут няма трагедыі, гэта пройдзе, як дзіцячая хвароба, — кажа прафэсар Адам Мальдзіс. — Пэўныя гістарычныя постаці належаць і Польшчы, і Беларусі. Як Манюшка і Касьцюшка, у якіх відавочныя беларускія карані. Але трэба найперш лічыцца зь іх нацыянальнай сьвядомасьцю. Акрамя гэтага, не заўсёды ўдаецца адназначна акрэсьліць, ці хтосьці належыць да польскай культуры, ці да беларускай. Яшчэ ў XIX ст. людзі лічылі сябе найперш патрыётамі рэгіёну, як Міцкевіч — Навагрудчыны, потым Вялікага Княства, а потым усёй Рэчы Паспалітай.

Адам Міцкевіч сёньня — адзін з найважнейшых пісьменнікаў, пра якіх даведваюцца ў школах беларускія дзеці, у тым ліку і ў расейскамоўных школах. У абавязковай праграме ёсьць таксама творы Элізы Ашэжкі і Генрыка Сянкевіча.

Пытаньне трактоўкі

Значная частка жыхароў Беларусі не параўноўвае сваю краіну з Польшчай ці яшчэ далейшым Захадам, нават зь Літвой ці Латвіяй. Толькі з Расеяй.

— А ў гэтым выпадку параўнаньне выходзіць нядрэннае, бо ў Расеі ўвогуле не шануюцца людзі працы, вэтэраны і пэнсіянэры, што паказвае паўсюль у Беларусі даступная расейская тэлевізія, — засмучаюцца многія беларускія апазыцыянэры.

Гэтую зьяву заўважаюць таксама дзеячы Зьвязу Палякаў у Беларусі (ЗПБ).

— Грамадзяне (10 млн. жыхароў) Беларусі перасякаюць мяжу Польшчы шэсьць мільёнаў разоў у год. Адныя дзесяць разоў, другія раз, іншыя ані разу. Тыя, што былі ў Польшчы, калі вяртаюцца, мусяць напэўна распавядаць пра ўзровень разьвіцьця, дагледжаныя вуліцы, каляровыя гарады, пра крамы, — разважае Тадэвуш Малевіч, віцэ-старшыня ЗПБ. — Ня ведаю, як яны гэта трактуюць, бо як даходзіць да якога галасаваньня, дык большасьць не выказваецца за заходні дабрабыт і стыль жыцьця, які прадстаўляе Польшча, а выбірае ўсходнія парамэтры.

На думку Малевіча, гэта парадокс. Асабліва ў заходняй частцы краіны, у Гарадзенскай і Берасьцейскай абласьцях, дзе шмат сем'яў жыве з Польшчы. Людзі бачаць вялікую розьніцу стандартаў, бачаць, што Польшча — гэта ўсё ж замежжа, а не, як казаў некалі намесьнік Каралеўства Польскага князь Гарчакоў і ня так даўно сьпявала Ала Пугачова: «Курица не птица, Польша не заграница».

Але чамусьці гэта іх не кранае. ■

быт авуха

Адна вялікая сям'я

Славамір АДАМОВІЧ

«Белтур», дом творчасьці і маньяк са шпрыцам

Дом творчасьці «Ісла́ч» пабудавалі ў 80-х: галоўны корпус, тры дамкі асобна, лазьня, кацельня, дом для абслуговага пэрсаналу. Кажуць, гадоў дзесяць назад шумна было ад пісьменьніцкіх галасоў на калідорах. Некаторыя па паўгоду сядзелі ў *сваім* доме. Цяпер Дом творчасьці выжывае з дапамогаю турыстычнай фірмы «Белтур». Пуцёўка на аднаго чалавека сёлета каштавала прыкладна 50 мільёнаў. Члены СП аплачваюць толькі харчаваньне. 12 дзён жнівеньскага заезду з 5-га па 17-га каштавалі 13 мільёнаў 200 тысячаў.

Пагаварыць і выпіць у «Ісла́чы» было з кім. У першы ж дзень пазнаёміўся з доктарам. Малады эскулап мяне ды госьця з Украіны чамусьці надта хацеў пачаставаць мясцовай самагонкай. Самагнёту ён, праўда, не дастаў, але набыў з рук «Двух буслоў». Пасьля першай гаваркі чалавек у белым халаце стаў распавядаць, што ў ваколіцах суседніх дзіцячых летнікаў з пачатку лета ходзіць мужчына са шпрыцам. Час ад часу ён пранікае ў спальні да дзяўчат-падлеткаў і, перш чым яго заўважаць, пасьпявае адной зь іх нешта ўкалоць, пасьля чаго дзяўчынцы робіцца дрэнна.

Толькі 24 жніўня, зірнуўшы на першую старонку «Навінаў», я зразумеў, што доктар не блефаваў.

Калегі

З 5-га па 17-га калега Ўладзімер Ліпскі пісаў кнігу пра кампазытара Ханка, які, дзесь я чуў, зьбіраецца на гістарычную радзіму і ўжо адправіў туды сваю дачку.

Толя Зэкаў адпачываў з жонкай і малой дачкою. А ці пісаў што, пра тое ня ведаю.

Перакладчык Пятро Кошалеў з Масквы быў. Дзьве кніжкі мае купіў. Гарэлкі ў бары наліваў ды распавядаў гісторыйкі з жыцьця былой партыйна-савецкай эліты. У гэтым пытаньні ён нядрэнна абазнаны.

Пад канец нашага адпачынку Раман Тармола-Мірскі прывёз у пісьменьніцкі дом сваіх жонку й дачку. Сам, праўда, не застаўся, таму зь ім мы нічога не пілі.

Цукровы кароль

Маючы 45, Косьця адседзеў шаснаццаць. Выйшаў. Паставіў дом, узяў жанчыну з трыма дзецьмі. Старэйшай прыёмнай дачцы наняў рэпэтытара па ангельскай мове. Спрабаваў са мной па-беларуску, але ў дачкі атрымлівалася лепш.

А на днях Косьця стаў «цукровым каралём» — пад яго кантроль адышлі гандлёва-закупачныя апэрацыі з цукрам у адным з рэгіёнаў Беларусі. І гэтай восеньню ён з асаблівым задавальненьнем памяняе свой абрыдлы «мэрс» на што-небудзь новенькае.

Чарнейка

Яна зьлёгку смуглая, далікатная фігура і далікатныя рукі, чысты мяккі твар. Завуць Ніна. Распавядае сваю прыватную бытавую гісторыю: у аўтакатастрофе загінуў муж; двое дзетак засталіся на руках; у яе самой слабое здароўе, а пасьля сьмерці гаспадара сям'і яно падупала яшчэ больш. І ўсё ж ні гады, якіх пад сорак, ні бяда-гора не пазбавілі жанчыну нейкай надзвычай лёгка-сьветлай энэргетычнасьці, жаноцкасьці. Волю да жыцьця, жаданьне чысьціні і прыгажосьці Ніна Чарнейка выяўляе ў паэзіі. У бібліятэчцы часопіса «Маладосць» выйшла сёлета ейная кніжачка вершаў «Грамнічная сьвечка». Гартаю старонкі, прачытваю радкі, сам сьвятлею, адтайваю, дабрэю, бо: «...жыцьцё — павуціначка тонкая, // невядома, калі абарвецца, // у гэтым сьвеце зялёна-рамонкавым // застаецца працяг — нашы дзеці...»

Такі лёс

Ёй сорак два. Яна была замужам. Яшчэ ёмкая, крэпкая целам і сымпатычная. Працавала многа дзе, нават цягала ў Польшчу айчынныя транты, але нічога на гэтым не зарабіла, толькі навучылася курыць. Усьмешлівая, жартаўлівая, адкрытая, даверлівая. Такую лёгка зьвесьці, нагаварыць-загушкаць. Ды калі падманеш яе — век той грэх не замоліш. Бо тут вось што — ня можа яна нарадзіць. Там у яе кіслотнасьць вялікая, і семя наша мужчынскае гіне ад гэтага. А жанчына яна добрая, я вам кажу, кожны нармальны мужчына абмыў бы ёй ножкі і ваду выпіў. Але ж дзеці!.. І таму яна адна: даверлівая, адкрытая, жартаўлівая, усьмешлівая. Ёй сорак два. Яна жыве з мамай, капае бульбу ў гародзе, тэлефануе замужняй сястры ў Менск і піша вершы. Цяпер і па-беларуску. ■

Заходняя Беларусь. Мяст. Ракаў.



Фота Анатоля Кляшчука.

МОДА НА ШЭДЭЎРЫ

«Воплі Відаплясава» 10 верасьня гралі ў канцэртнай залі «Менск»

Спачатку былі «Таньцы». Адна-адзіная песьня, якая перавярнула калі ня сьвет, дык увесь андэграўнд колішняга Савецкага Саюзу і якая нараджае сабе новых і новых фанатаў. Ня дзіва, што калі на апошнім менскім канцэрце «ВВ» разьвіталіся гітам «Вясна», дзея ня скончылася. Заля раўла-заклінала — «Таньцы»!..

Гэтая просьценькая паводле сюжэту песенька пра тое, што «работнікі заморыліся працаваць» і што «ў клюбе былі любы таньцы, та-та-та-таньцы», ёсьць ключом да сакрэту трывалай папулярнасьці «Вопляў». Песьню можна выконваць у якасьці сольнага канцэрту бясконца, бо ў ёй галоўнае ня словы, а рытм і непаўторны «ВэВэшны» настрой.

«Воплі Відаплясава» стартавалі на захадзе «перастройкі» з іміджам «простых украінскіх хлопцаў» з рабочага ўскрайку. У тыя часы гэта было сапраўдным панкам. «Пасьлядоўнікі» «ВВ» зь Беларусі «Ляпісы» «касілі» пад «нармальных беларускіх пацаноў» і ў вачох менскага андэграўнда таксама выглядалі панкамі — крутым сьцёбам. Але далей фантазія «Ляпісаў» не пайшла, таму сёньня яны «панкуюць» у якасьці кандовых расейскіх папсавікоў, а «Воплі» кшталтуюць сваю лірык-рокавую гульню, пашыраючы «моду на ўкраінскае» па ўсёй тэрыторыі «трыславянскай» прасторы.

Фота Сяргея Шарубы.

Канцэрт «ВВ» 10 верасьня стаўся другім беларускім выступам гурта пасьля леташняга красавіцкага. Тады галоўны «ВэВэшнік» Алег Скрыпка быў агаломшаны пад завязку забітай заляй і авацыямі, якія пачаліся зь першых акордаў выступу. Ён сказаў, што прыемна зьдзіўлены і што для яго, як для большасьці ўкраінцаў, Беларусь — загадкавая краіна. Скрыпка мае рацыю — наша краіна загадкавая. «ВВ» зламалі каляніяльны ўкраінска-беларускі стэрэатып пра тое, што толькі па-расейску можна ствараць шэдэўры. Тым ня менш, замест таго каб ствараць свае шэдэўры, процьма нашых і ўкраінскіх выканаўцаў пхнецца заваёўваць Расею на «іхным языку». Ёсьць яшчэ Захад. «ВВ» зрабіліся «афіцыйна прызнанымі» *тут*, калі вярнуліся прызнанымі *там* — у Францыі... Але перад тым «ВВ» стварылі «веселі, добрі таньцы», якія перавярнулі «савок».

Беларускія рокеры ў прынцыпе ніколі не глядзелі на Ўсход. Некаторыя нашыя рокзоркі распавядалі, што маскоўскія прадусары прапаноўвалі кантракты пры ўмове стварэньня праграмаў па-расейску і шалелі, бо не маглі зразумець прычынаў саркастычных адмоваў... Ці можа ў Расеі зьявіцца «мода на беларускае», як гэта зрабілі «ВВ» з «украінскім»? Толькі пасьля таго, як «мода на беларускае» зацікавіць саміх беларусаў.

Квят.

«Рок па вакацыях'99»

Запачаткаваная ў 1992 годзе як адкрытае, бясплатнае музычнае сьвята імпрэза зрабілася візытоўкай кожнага чарговага рок-сэзону. Толькі аднойчы яна распачыналася ня ў першы дзень восені, а 9 верасьня. Але сёлета традыцыйнага першаверасьнёўскага сьвята не адбылося. «Рок па вакацыях'99» адбудзецца 19 верасьня ў форме адкрыцьця новага рок-клюбу «Джунглі», які разьмесьціцца ў памяшканьні кінатэатру «Вільнюс». Як паведамілі арганізатары, імпрэза будзе не публічная, а «элітарная», з запрашальнікамі. «Мы яшчэ летась былі непрыемна ўражаныя дзікімі паводзінамі публікі, бойкамі і ўсім такім, што адбылося ў парку Чалюскінцаў на «Року па вакацыях'98», — кажа Юры Цыбін, арганізатар сьвята, — але сёлетнія падзеі 30 траўня на Нямізе нас пераканалі, што ладзіць музычныя імпрэзы на адкрытай пляцоўцы ў нас небясьпечна. Можна шмат казаць пра недагляд уладаў і арганізатараў, але найперш маладыя гледачы вінаватыя ў тым, што здарылася трагедыя. Мы дагэтуль у шоку, таму вырашылі адысьці ад традыцыяў «Року па вакацыях», перанесьці дату правядзеньня і зрабіць імпрэзу сустрэчай па вакацыях «для сваіх».

С.К.

Сарваны канцэрт

8 верасьня беларускімі ўладамі быў сарваны канцэрт «NRM», прысьвечаны 485-й гадавіне Бітвы пад Воршай. Нягледзячы на аплату электраэнэргіі з 15.00 да 20.00, адразу пасьля пачатку мастацкай часткі а 18-й зьнікла энэргія. Вярнуўшыся з пэрфомансу «Навінкі '99», Кабінэт Міністраў «NRM» праз мэгафон зьвярнуўся да сваіх прыхільнікаў, якіх сабралася пара тысяч чалавек, пажадаў хутчэйшага вяртаньня ў незалежную краіну й запрасіў на наступныя канцэрты. «Ім усім ГАМОН!» — адказалі фанаты.

Вядучы «Вольных танцаў» у якасьці кампэнсацыі за канцэрт, якога не было, раздаваў кашулі «Хартыі'97» і налепкі «Stop — Luka», што ўсім прыйшлося даспадобы.

Наступная акцыя з удзелам беларускіх рок-камандаў запляванаваная на «Маршы свабоды» — 17 кастрычніка. Пад час мітынгу некалькі скіноў спрабавалі завязаць бойку, але, нарваўшыся на нечаканых хлапцоў з Партыі Свабоды і Маладога Фронту, атрымалі па галовах і вымушаныя былі зьбегчы.

У бліжэйшы час Беларускім Народным Фронтам будзе пададзены іск у суд на Менгарсьвятло за невыкананьне аплочаных паслуг.

В.С.

Официальная Хроника

Андрэй Усьціновіч
«ПанРекордз», 1998

Чымсьці гэты альбом нагадаў мне выданьні беларускае тэлепраграмы «АТН»: так, згодны, зроблена з пэўнай ідэяй, але занудна, аднастайна, без эмацыйных усплёскаў і цікава, бадай, толькі для тых, хто гэты праект і ўвасабляў у жыцьцё. Такім чынам, зьмешчаныя на вокладцы нумар пэйджэра ды эмэйлавы адрас, на якія, як вынікае з суправаджальнага тэксту, заклікаюць зьвяртацца з нагоды вялікага жаданьня арганізаваць канцэрт трыо хранікёраў, мне думаецца, застануцца без спадзяванае нагрузкі. Не, магчыма, хто і пазвоніць, але адрасаваныя тэксты для далейшага друку наўрад ці будуць прыдатныя.

І не таму, што музычны матэрыял альбому безнадзейны. Не! Якраз музычная падкладка даволі небанальная для беларускае музычнае рэчаіснасьці і рэдкая. Музыка заснаваная выключна на сынтэзаваным гучаньні і кампутарным зьвядзеньні і як самастойная зьява магла б пры пэўнай сытуацыі пацягнуць нават на годную творчую заяўку (у горшым выпадку — як застаўкі для таго ж «АТН»). Так што з пункту гледжаньня ўвасабленьня музычнае асновы работа выглядае цалкам прафэсійнай (аўтар праекту, словаў ды музыкі Андрэй Усьціновіч, цяпер жыхар Сыэтлу, аранжаваньне віцябляніна Чуры Шандара). Вакальную партыю выконвае мянчанка Алена Сяргеева і робіць гэта часам не бяз пэўнае заўзятасьці і ўменьня («Четыре стены», напрыклад). Але ў цэлым зробленая міжнародным трыо работа пакідае ўражаньне нейкае стравы, згатаванае выключна для задавальненьня ўласных густаў, нягледзячы нават на цытаваньне ледзь не клясычных ужо мэлёдыяў (як у «Джоконде», напрыклад). Цытаваць можна, але трэ памятаць, што нічога лепшага за цешчын боршч усё адно не бывае.

Але калі зьвярнуцца да ў пэўным сэнсе эпіграфу праекту, прыведзенага на адмыслова зробленай укладцы (цытую: «Проект «Официальная хроника» был задуман как музыкальные картины жизни девушки современного большого города...»), жаданьня наведаць той горад ці яшчэ больш — пазнаёміцца з той дзяўчынай — не ўзьнікае наагул. Больш за тое: узьнікае жаданьне ў любым выпадку пракладваць маршруты падарожжаў так, каб абмінуць і той горад, і тую дзяўчыну. Не таму, што дзяўчыны ў мяне не выклікаюць ужо аніякіх жаданьняў, не таму, што арыентацыі ў плоці і прасторы зьмяніліся. Проста часу і грошай шкада на такія падарожжы. Прынамсі, ёсьць больш латвы сродак: уключыць тое самае «АТН» (напрыклад). І атрымаеш такія музычныя карцінкі, пасьля якіх нічога слухаць ужо і не захочацца.

Музычна матэрыял альбому даволі складаны, увасобіць яго, асабліва сьпявачцы, было няпроста. І пасьля доўгага роздуму адносна таго, чаго ж, на маё разуменьне, тут не стае, я прыйшоў да высновы: не стае нармальных, чалавечаскіх мэлёдыяў. Ну, не такіх, якія ўжываюць зоркі эстрады з Усходу, малюючы карцінкі жыцьця дзяўчат Масквы. А такіх, якія пры нагодзе можна насьвістаць, «широким проспектом шагая» на сустрэчу з адной з прадстаўніц насельніцтва таго гораду. Нешта накшталт «Минск — это я». Тут жа — сьвісьці не сьвісьці — нічога ня выйдзе. Ня той праект, зразумела. Але, як сьпявае спн. Сяргеева, калі «девичьи гормоны не знают покоя», можна было б заняцца нечым іншым. Асабліва мужчынам — аўтарам словаў ды музыкі.

Бо, калі мець на ўвазе жанр афіцыйнае хронікі і стаяць перад выбарам, што ж чытаць — «Советскую Белоруссию» ці «Гастроном», я ўсё ж абяру апошняе. Прынамсі, у спадзяваньні, што пакаштую нешта больш ядомае...

Вось вокладка касэты — прыгожая.

Хранічны Слухач

Старыя назовы

«Грунвальд»
БМА, 1998

Калі прыйдзе час і патрэба ў стварэньні энцыкляпэдыі беларускай рок-музыкі, то ў ёй абавязкова павінен быць разьдзел, прысьвечаны рок-н-ролу Полаччыны. Процьма падзеяў рок-гісторыі зьвязаная з Наваполацкам, і ўсё гэта рабілася пры большым ці меншым удзеле аднаго апантанага музыкай навапалачаніна — Сяргея Анішчанкі, альбо проста Анісы.

Вось і касэтка з запісамі наваполацкага гурта «Грунвальд», выдадзеная намаганьнямі, адлюстроўвае адзін з этапаў дзейнасьці Сержука і яго сяброў па гурце «Грунвальд», які «ўзьняўся на крыло» пад час аптымістычнага пэрыяду — у 1992 годзе.

Нягледзячы на тагачаснае адзначэньне стылю «Грунвальда» як гард-року, па новай БМА касэце мы можам канстатаваць, што стыль гурта — папрок з элемэнтамі гард і артроку. Як патлумачыў сам Сяржук Анішчанка, такі стылістычны расклад абумоўлены асаблівасьцямі існаваньня рэгіянальных гуртоў, якім у большай ступені, чым сталічным, трэба дбаць пра пашырэньне сваёй музыкі ў дыскатэцы, пра месца ў штатным раскладзе гарадзкога парку культуры і адпачынку... Вось яна, проза жыцьця і творчасьці правінцыйнага музыкі. Вось гэты «выканаўчы кактэйль» і даў песьні, якія запомніліся слухачам усёй Беларусі: «Чароўная Ганна», «Варварам з Валынцаў», «Зьніч», «Спадчына». Мэмарыяльная зборка «Грунвальд» — добры напамін пра часы надзеяў і ўздыму.

Анатоль Мялыгуй

Халі-галі

«Мясцовы час»
«Мясцовы час», 1998

Даўно не атрымліваў гэткага задавальненьня ад слуханьня такога гатунку музыкі, у якім, здавалася б, было ўсё напісана ды выканана гадоў гэтак з дваццаць таму. Калі ня трыццаць. А тут — на табе! Стрэлкі гадзіньніка паказваюць, што па-мясцоваму, па-тутэйшаму, тая, шчыра кажучы, у пэўным сэнсе стандартная ўжо музыка можа гучаць цалкам няблага, дынамічна і — прабачце, заходнія дыназаўры року, — пасьвежаму. «Мясцовы час» нарадзіўся наноў і выдаў сапраўды ўпэўнены, стылёвы, роўны альбом, напэўна ня ставячы перад сабой задач некага зьдзівіць ці ўразіць. Гэткія «AC/DC» зь беларускае поўначы запісалі колькі новых нумароў, зь якіх найбольш вядомы («Пра Любоў») напэўна не зьяўляецца найбольш удалым ці характэрным. Ён проста найбольш вядомы ды раскручаны, з тэкстам, напісаным з пэўнай, добрай такой іроніяй.

Бо калі браць пад увагу сур'ёзнасьць выказваньня, больш вартыя ўвагі, на маю думку, такія песьні, як «Брэйк данс» ці «Будзе так!» (па-полацку — «Let It Be») — з пункту ўнутранае арганізацыі амаль клясычныя творы напрамку гард-энд-геві. Вядома, такую музыку можна назваць і другаснай, ды нічога дрэннага ў тым няма. Хоць бы таму, што мы маем дачыненьне да залатой сярэдзіны рок-н-ролу — музыкі, як вядома, простай, энэргічнай і збольшага няхітрай для ўспрыманьня. Затое яна шчырая і жывая, з тэкстамі, якія часьцей пішуцца пераважна «па прыколу», чым ставяць перад слухачамі задачу ўслухацца ў праблемы рэчаіснасьці (як іх разумеюць рок-н-рольшчыкі). І не таму, што ўсе яны такія вось беспраблемшчыкі ці дафяністы газіраваныя, а таму, што ня ўсе праблемы жыцьця вырашаць аднаму рок-н-ролу.

Што да «МЧ», дык у сэнсе радасьці, скіраванай на ўздым аптымізму ва ўсяго насельніцтва краіны, лепшай назваў бы песеньку «Дывэрсант па мянушцы «Жгут», куды надзвычай дарэчы і з добрым гардавым гумаркам уплеценая тэмка зь першага савецкага шпягоўскага тэлесэрыялу «17 імгненьняў вясны» аўтарства Тарывердыева-Леграна з пэўнымі ўкрапленьнямі ад «Болека і Лёлека», што выскачылі з-пад рук Лявона Вольскага. Што лішні раз пацьвярджае: у гэтым жанры па-новаму можна выконваць нават тое, што ўжо было зроблена іншымі.

Дарма, дарэчы, мясцовыя зэгарщчыкі вырашылі самі тыражаваць альбом: у дадзеным выпадку прасілася куды больш вартасная і поўная па інфармацыі паліграфія. Таксама варта было б паспрабаваць прарэклямаваць альбом больш актыўна, хоць бы таму, што ён гэтага варты.

Памятаецца, у сваім першым жыцьці «МЧ» глядзеліся на сцэне і гучалі зь яе далёка ня так зладжана і шчыльна, як тое чуваць з гэтае касэты. Калі музыкі здолеюць зьберагчы тое ўменьне ў будучыні і пад час сваіх канцэртаў, група мае ўсе шанцы прэтэндаваць на такое званьне, як «найбольш завадная каманда».

Чаго? Ну, гэта ўжо пытаньне не да мяне...

Мясцовы Слухач



100 твораў мастацтва XX стагодзьдзя

Уладзімер Савіч. ...А зязюля кукавала

Уладзімер Савіч увёў у беларускае мастацтва цэлую жменю стэрэатыпаў, якія сталі складнікамі беларускага стылю. Напрыклад, антрапалягічны тыпаж беларуса як віславусага, з шавялюраю, зь вялікімі выразнымі вачыма і абавязкова сухаватага, з рэзка акрэсьленымі пашчэнкамі й храшчаватым даўгім носам зь лёгкай гарбінкаю. Існуе думка, што ў кожным партрэце мастак выяўляе самога сябе. Можа і гэтак. Аднак выразны тыпаж Савічавых беларусаў прыжыўся. Прыжыліся й ягоныя стрыжаныя вербы ўздоўж патанулых у смузе гасьцінцаў, шматкроць паўтораныя самім мастаком і ягонымі вучнямі ды кампілятарамі. Стэрэатып беларускага гасьцінца. Прыжыліся запушчаныя ім птушкі. Лёгкія, бязважкія. Ягоныя птушкі маюць выраз вачэй, падобны да выразу вачэй ягоных жа беларусаў. Бо гэта вочы беларускіх птушак.

...Пошукі нацыянальнага стылю, якія распачалі беларускія графікі на мяжы 60—70-х гадоў, былі імпэтна працягнутыя пакаленьнем, якое прыйшло ў нашае мастацтва на пачатку 80-х. Іхную плыяду лучыла тое, што ў большасьці яны былі родам з правінцыі, атрымалі тутэйшую адукацыю і свае творчыя амбіцыі рэалізавалі тут. Менск у тыя часы амаль цалкам зманапалізаваў усе ступені мастакоўскае адукацыі ды й мастацкае жыцьцё наагул. Гэткім, зрэшты, чынам была створаная тая глеба, на якой паўстала найноўшая школа мастацтва. Тая школа, што нарэшце ўвасобіла інтуітыўныя памкненьні стаць *выказьнікамі* беларушчыны.

Шлях Уладзімера Савіча ў гэтым сэнсе — клясычны. Вясковым хлопцам ён патрапіў у Рэспубліканскую школу-інтэрнат імя Ахрэмчыка, дзе сабралося нямала гэткіх жа дзяцей з усяе Беларусі, пасьля са сваімі ж аднаклясьнікамі скончыў Мастацкі інстытут. І першыя самастойныя крокі ў ягонай творчасьці — гэта крокі найперш у беларушчыну. Спачатку — ілюстрацыі да «Пінскае шляхты» Дуніна-Марцінкевіча, створаныя яшчэ пад час навучаньня ў інстытуце, якія адразу сталі клясычнымі. Першая спроба ў нашым стагодзьдзі прачытаць гэтую кнігу ў сучасным кантэксьце. Выйшла не мадэрна, але па-беларуску. Наступнымі крокамі сталі графічныя нізкі «Беларускія мадонны» й «Голас Купалы»...



Уладзімер Савіч (1952, вёска Хатавічы, Меншчына) графік, ілюстратар, пэдагог. Скончыў школу-інтэрнат імя І. Ахрэмчыка ў 1970 годзе. Пазьней, у 1976 — Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, дзе й застаўся выкладаць сам. Заслужаны дзяяч мастацтваў Беларусі. Ад 1996 году прафэсар. Творы зьберагаюцца ў калекцыях Беларусі, Польшчы, Фінляндыі, Расеі й Славаччыны.

Першая кніга, якую Савіч аздобіў у 1982 годзе, «Казка пра суседзяў, зьмяю і мядзьведзяў» Ніны Мацяш, заваражыла беларускую публіку. Дакладна вывераными кампазыцыямі, багацьцем дэкаратыўных прыёмаў, у якіх сплятаўся і арнамэнт, і ўмоўна-плоскасныя выявы пэрсанажаў зь нечакана дынамічнымі іхнымі ракурсамі й рухамі. Шчыльна ўвагнаныя ў рамы старонак, гэтыя пэрсанажы здаваліся манумэнтальнымі. Дзівіла і трактоўка іхнае *беларускасьці*. У эклектычным зьмяшаньні строяў Століншчыны ды Дзьвіншчыны перад вачыма паўставаў экзатычны сьвет казачнае Беларусі. Між тым, прыёмы, якія прывабілі беларускага гледача, што беспамылкова пазнаваў у іх сваё, былі запазычаныя зь літоўскай кніжнай графікі 70-х гадоў, часам даволі дакладна. Прытым у літоўцаў жа было запазычанае й калярыстычнае самаабмежаваньне. Анэмічная каляровая гама не сьпявала. Мо й таму, што гэта быў пераклад зь літоўскае...

Наступным этапам для Савіча стала далейшае шуканьне беларускай экзотыкі, найбольш адметных этнаграфічных праяваў. У пачатку 80-х ён шмат вандруе па краі. Гэтаму паспрыяла ягонае сяброўства зь Міхасём Раманюком, этнографам і мастацтвазнаўцам, чый пэрсанальны ўплыў на маладых мастакоў быў у тыя гады асабліва адчувальным. У выніку падарожжаў нарадзіліся нізкі «Па Меншчыне», «Палесьсе» й дыптых «Маці-Бацькаўшчына». У гэты ж пэрыяд пачынае расьці слава мастака, падтрыманая й на дзяржаўным узроўні. Усе ягоныя сэрыі адразу ж трапляюць у фонды Міністэрства культуры й Саюзу мастакоў.

Пасьля Савіч вяртаецца да ілюстраваньня кніг. Балазе, у той пэрыяд выдавалася багата беларускае літаратуры. Ён ілюструе Івана Чыгрынава, Ніла Гілевіча, Васіля Вітку... І ўсе яны атрымоўваюцца не савецкімі, а... эрзацна-этнаграфічнымі. Творчай вяршыняю для Ўладзімера Савіча сталі ілюстрацыі да казкі «З рога ўсяго многа». Шэсьць графічных аркушоў да гэтае кнігі былі закупленыя ў Трацякоўскую галерэю ў Маскве. Аднак гэта стала і канцом этнаграфічнага пэрыяду. Пошукі ў беларускай клясычнай спадчыне замыкаліся на неперааддольнасьці ўжо напрацаваных стэрэатыпаў. Кампіляцыі зь літоўскага, нямецкага ды яшчэ якога мастацтва ўжо ня цешылі.

Цяпер Савіч ставіць на колер. Ягоныя творы становяцца ўсё больш жывапіснымі, ён пачынае працаваць амаль выключна ў акварэлі. Разнастайнасьць акварэльных прыёмаў ды непазьбежная для іх лёгкасьць прадыктавалі новую манеру. Ягоны аркуш «...А зязюля кукавала», сюжэт якога быў падказаны народнай песьняй, пазначыў пераход да новай манеры.

Перадусім гэта чысты празрысты колер, які датклівa кладзецца на паперу, выяўляючы й проста натуральныя якасьці матэрыялаў. Лёгкія эскізныя пісягі ад адзінага дотыку пэндзля ствараюць у адно імгненьне аб'ём і прастору. Блізу як у Цы Бай Шы, клясыка кітайскага акварэльнага жывапісу, чыя творчасьць стала добра вядомаю ў нас у тыя гады. Аднак у Савіча, што перайшоў на новую пластычную мову, былі іншыя задачы. Не віртуознае адлюстраванне рэчаіснасьці, а стварэньне сваёй рэчаіснасьці мэтафізычнае Беларусі. У гэтым сэнсе надаўся менавіта матыў песьні, непрыметны, пачуцьцёвы, падсьведамы. Умоўнасьць народнае лірыкі прадыктавала ўмоўнасьць мастацкіх прыёмаў. Празрыстасьць птушынага пер'я, зіхоткія кроплі. Буйныя, пакладзеныя адным праходам шырэйшыя плямы, і дрыготкія, дробныя, пакінутыя на паперы адно паўсухім кончыкам пэндзля. Птушынае пер'е, сабранае ў складках, паўтарае архаічны матыў яйка, што ўродзіцца з той птушкі. Зязюльчыных яек будзе шмат. Заўсёды. Інтуітыўны пераказ народнага вычуваньня.

І дрэвы. Не разьляпістыя, не па-імпрэсіянісцку падгледжаныя, а ўсё тыя ж казачныя *вобразы* дрэваў. Бо толькі між іх, вобразаў, можа куваць вобраз песеннае зязюлі. Тут надаўся й кампазыцыйны прыём, у выніку якога птушка, зьмешчаная на пярэднім пляне, апынулася шматкроць большаю за дрэвы, утварыўшы ўмоўную дэкаратыўную прастору.

І птушкі, і дрэвы прыйшліся даспадобы Савічу. Яны, нібы шчасьлівы талісман, вывелі ягоную творчасьць на тыя абсягі, дзе ягоны акварэльны жывапіс стаў клясыкай графічнага мастацтва. Ён іх паўтараў шматкроць, стварыўшы яшчэ адзін са стэрэатыпаў, зь якіх складаецца тое, што мы завем беларускім мастацтвам.

Сяргей Харэўскі

Менск нагадвае брытанцу Токіо

У Менску адбыўся фэстываль пэрфомансу «Навінкі'99» — падзея нечуваная й нябачаная. Сярод удзельнікаў акцыі былі Рычард Лайзэл (Англія), які працуе ў гэтым жанры больш за 30 гадоў, і Ноэл Мэлой, вядомы пэрфомэр з Ірляндыі. Рычард Лайзэл літаральна ўзарваўся, калі яго спыталіся, чаму ён прыехаў на гэты фэстываль (пытаньне, поўнае чыста беларускага мазахізму): «Кожны раз, калі мне задаюць такое пытаньне, хочацца адказаць на яго падобным пытаньнем: а вы як думаеце? Па-мойму, абсалютна відавочна, чаму мы прыехалі: мы жадалі прыехаць, мы верым у тое, што робім, і было вельмі важна быць запрошанымі ў такую краіну як Беларусь, дзе раней ніколі не было фэстывалю пэрфомансаў. Вельмі важна паказаць свае творы новым людзям, завесьці новых знаёмых. І рэзананс проста фантастычны — велізарная колькасьць людзей прыходзіць паглядзець на тое, што мы робім. Грошы не заўсёды ўсё вырашаюць. Як і тут, на Захадзе, многія мастакі не зарабляюць шмат грошай. Ноэл і я — небагатыя людзі. Але чаму б нам не прыехаць, калі ёсьць нагода?»

«НН»: Як глядзяцца «Навінкі'99» проці заходніх фэстываляў пэрфомансаў?

Р.Л.: На маю думку, галоўная розьніца ў тым, што тут няма цынізму. Захад толькі-толькі пачынае адкрываць вашу культуру, і яна сама зусім нядаўна пачала адкрывацца, таму тут такі высокі ўзровень абсалютна шчырай цікавасьці.

Н.М.: У Эўропе вельмі шмат хто кажа сам сабе: «А, гэта пэрфомансы, я ведаю, што гэта такое — купка ідыётаў, якія займаюцца розным бессэнсоўным глупствам».

Р.Л.: Мне здаецца, эўрапейскі цынізм, які не дае людзям хадзіць на пэрфомансы, грунтуецца на тым, што пэрфоманс здаецца ім нечым даўно знаёмым. Рэч таксама і ва ўплыве тэлебачаньня на гледачоў. Яно магутнейшае за тэатар, за жывую музыку... Тут такога яшчэ няма.

«НН»: Што вы можаце сказаць пра беларускія пэрфомансы?

Н.М.: Усё, што мы бачым тут, вельмі падобнае да амэрыканскіх ці эўрапейскіх пэрфомансаў. Выдатна, што ў сваіх творах яны кажуць пра беларускія цяжкасьці, таксама, як і я кажу пра ірляндзкія, а Рычард — пра ангельскія. Пэрфоманс неабавязкова распавядае пра сацыяльныя ці палітычныя праблемы. Ён можа быць такім жа вытанчаным, як балет — мне ўзгадваецца адзін з учорашніх пэрфомансаў, калі мастак намаляваў віном кола — задача ў тым, каб прымусіць людзей рэагаваць, каб самому бачыць гэтую рэакцыю. Ты — адзін на адзін з гледачом.

Р.Л.: І гэта як паэзія — не заўсёды можна зразумець сэнс твору. Я не магу сказаць шмат пра свой пэрфоманс. Казаць нешта пра пэрфоманс — значыць, спрашчаць. Я стварыў свой апошні пэрфоманс менавіта да гэтага фэстывалю, для беларусаў. Вось што я хацеў сказаць ім: ня трэба зайздросьціць Захаду. Людзі там ня больш шчасьлівыя, чым тут. Мы аднолькавыя істоты ў розных грамадзтвах, якія могуць размаўляць на адным і тым жа ўзроўні. І вельмі часта людзі трапляюць у бруд з-за грошай. Іх можа быць шмат, яле не яны робяць чалавека шчасьлівым.

«НН»: Што хацелі сказаць беларускім гледачам вы?

Н.М.: Мой пэрфоманс носіць назву «26 гадоў нядзеляў. Зона зьмярканьня»(«26 Years of Sundays. The Twilight Zone»). Асаблівасьць ягоная ў тым, што ён прысьвечаны расстрэлу брытанскай арміяй мірнай дэманстрацыі ў Паўночнай Ірляндыі ў 1972 годзе, што атрымала назву ірляндзкай Крывавай Нядзелі. Прайшло 27 гадоў з таго часу, як гэта здарылася, і толькі ў мінулым годзе, праз 26 гадоў, пачалося сапраўднае расьсьледаваньне. Упершыню слухаюць сьведкаў. Родныя забітых жадаюць адзінага: каб у гісторыю ахвяры увайшлі не як тэрарысты, а як мірныя дэманстранты.

Мне вельмі цікава абмяркоўваць беларускія праблемы, зьвязаныя са станаўленьнем незалежнасьці, бо яны вельмі падобныя да ірляндзкіх, асабліва палітычная сытуацыя.

«НН»: Што зьяўляецца самай вялікай праблемай мастацтва ў Ірляндыі і ў Эўропе ўвогуле?

Н.М.: Успрыманьне мастацтва. І, вядома, ёсьць фінансавыя праблемы. Калі іншыя віды мастацтва добра спансаруюцца, на пэрфомансы грошы даюць неахвотна, а як часавае мастацтва пэрфоманс мае патрэбу ў падтрымцы свайго існаваньня. Ён вельмі моцна залежыць ад спонсараў. Я, напрыклад, атрымаў грошы на паездку сюды ад сваіх мясцовых уладаў — я жыву ў самым цэнтры Ірляндыі, а таксама ад Рады мастацтваў Ірляндыі.

«НН»: Якія вашыя ўражаньні ад Менску?

Р.Л.: Гэта горад, які трэба пазнаць. Толькі цяпер, праз пару дзён, я патроху пачынаю разумець яго. Ён нагадвае мне Токіо. Я быў там і ніяк ня мог зразумець гэтае места. Але зараз я пачынаю адчуваць Менск. Шкада, што так шмат у ім разбурана. Менск ствараюць людзі, а не архітэктура. У Лёндане, дзе я жыву, гісторыя хаваецца ў кожным будынку, і гэта робіць людзей крыху кансэрватыўнымі. І ў тым, каб жыць у горадзе, які ня мае свайго выразнага твару, таксама ёсьць выгоды. Гэта вымагае ад людзей большай духоўнай моцы.

Гутарыў Аляксандар Кудрыцкі



Фота Аляксандра Кудрыцкага.

«Навінкі'99». Рычард Лайзэл. Пэрфоманс «Халодная гара» (Cold Mountain)

Фота Алеся Лубнеўскага.

Заходняя Беларусь, Панямонь, плавучы мост

УНІЗ ПА БУСЬЛІНАЙ РАЦЭ

На байдарках па Нёмане ад Стоўпцаў да Сяльца

Гэтак здараецца заўсёды. Спачатку ўсё тваё нутро ўпарта ня хоча ўспрымаць новую рэальнасьць. Маланкавая хуткасьць, зь якою запыленыя краявіды праносяцца за бруднымі вокнамі чыгуначнага вагона, нязвыкла муліць вока. Бліскучыя каляровыя самаходы за кароткімі палошчатымі бэлькамі шлягбаўмаў на пераездах паглядаюць дзівоснымі міжплянэтнымі балідамі, а знэрваваныя людзі ў нязручных гарадзкіх строях, паселыя на суседніх лавах, — нібы візыторамі з паралельнага сусьвету. Ты сядзіш, перабіраючы струны нечутное ў грукаце мэталёвых колаў гітары, і сумна паглядаеш на сваіх няголеных спадарожнікаў, што, згрувасьціўшыся пасярод гары мурзатых старых заплечнікаў, спрабуюць адолець немаведама адкуль паўсталую скруху сьвежымі ўспамінамі з вандроўкі.

А потым усіх засмоктвае горад і вынішчае з памяці прыгожыя дробязі. Але, на шчасьце, штосьці застаецца.

За адзіны тыдзень хвалісты вадзяны гасьцінец давёў нашую шурпатую мужчынскую кампанію з шасьцю галовамі ад Стоўпцаў ажно да самага Сяльца, што ля Бярозаўкі. Дзень пры дні даўгія зялёныя байдарачныя стрэлкі чэрылі цёплую бліскавічную паверхню, то зарываючыся вострымі насамі ў высокія нерухомыя хвалі ћа жоўтых водмелях, то сядаючы падцягнутымі жыватамі на схаваныя вадою палі даўнейшых масткоў.

Здаўна гэтая дарога называлася Нёманам, што на старажытналіцьвінскай, паводле пэўных аўтараў, значыць «свойскі» або «дамашні». Крыху раней — Хронусам, ракой часу, як зазначае Пталемэй у сваёй шматфунтовай «Геаграфіі» на самым пачатку нашае эры. А як называлі Раку тыя невядомыя людзі, што паселі на яе берагох дзесяць тысяч гадоў таму, не дазнаецца ніхто.

Стагодзьдзі з тры назад яшчэ бегалі паўз прыязныя прыстані ў Любчы ці, скажам, Купіску хуткія віціны пад белымі ветразямі, што, як заўжды, сьпяшаліся адвечным шляхам з варагаў у грэкі. Першы, самы старажытны субмэрыдыянальны гандлёвы калідор пралягаў з Балтыкі па Заходняй Дзьвіне й Дняпры. Лёгка ўяўляецца, як паважныя купцы заклапочана совaліся па прыбярэжных наднёманскіх карчомках, вышукваючы вясёлых хлапцоў са слаўнага Бярэжна — лепшых лоцманаў на рацэ ня знойдзеш.

Бярэжна мы тое бачылі. Адзінаю згадкаю даўніны — вузенькія цяністыя алеі з агромністых срэбных ясакараў над ракою. Ды яшчэ сьветлая летуценная бажніца бяз даху й гаспадара на старых могілках. Столі няма. У раскіданым алтары сьвятараць адно кволыя маладзенькія бярозкі...

Адметная рыса Нёмана — шырокія плавучыя масты-насьцілы. Колькі слаёў таўстых яловых дошак пакладзеныя проста на ваду. Першае гэткае збудаваньне пераняло нашую вандроўную грамаду ў Панямоні. Пакуль хлопцы перацягвалі берагам важкія байдаркі, я аглядаў першае й апошняе за ўвесь наш панямонскі тыдзень паселішча, што раскінула свае дворы абапал ракі. Пажылы дзядзька з роварам, утаропіўшыся ў цёмную ваду, распавёў, што некалькі апошніх стагодзьдзяў аж да семідзясятых гадоў цяперашняга праз Панямонь гналі лес; што, прапускаючы даўгія плыты, некалькі зьвеньняў моста падцягвалі да берагоў уверх па плыні (непатрэбныя ўжо, шэрыя й сумныя казлы-калаўроты з рэштамі зьедзеных іржою трасоў сапраўды паглядалі з выскубаных скацінаю берагоў); што даўней, каб не блукаў па рэчышчы фарватар ды захоўвалася глыбіня, будавалі з драўляных паляў ды валуноў гэтак званыя тумаваньні.

Гладкія сьвіньні капаліся на пясчанай паўвыспачцы. Сонейка хавалася за разлапістыя дубы на захадзе, заліваючы памаранчам старадаўнюю Панямонь. Густа рыкаючы, па ружовым беразе й няроўнай зьмейцы плывучага моста сунуўся дамоў статак. На агромністай разваленай калгаснай стайні клекатаў бусел.

Мэліярацыя, якая, напэўна, ёсьць адным з сымбаляў бязглуздага савецкага вандалізму, балюча кранула й Нёман — ён «праваліўся» больш як на паўтара мэтры. Фактычна, славутая водная артэрыя Вялікага Княства перастала існаваць. Застаўся толькі зьвілісты напамін былое велічы. Бо яшчэ пасьля вайны нават у верхнім цячэньні сярэдняя глыбіня была каля трох-пяці мэтраў. Сёньня ж такія бездані сустрэнеш хіба што ў заваленых карчамі вірах Графскае Пушчы. А так — лічы, кожную сотню мэтраў вясло рыецца ў чысты жоўты пясочак...

Праплылі праз Шчорсы з закінутай, зьняважанай будынінай храптовіцкае бібліятэкі й нашчэнт згнілым пнём Міцкевічавага дуба; Любчу з касьцёльнаю вежай, ператворанай у вялізны сьметнік; Дзяляцічы з хандогай-цэркаўкай у старым парку; Морына з царкоўнікам, дзе мірна суседзяцца магілкі з рускімі — зь «яцямі», ды польскімі — пад шляхецкім гербам — надпісамі на помніках.

Засталіся рубінавыя гронкі парэчак і п'янкі водар дзікіх флёксаў у пушчы, высокія, падобныя на сьвечкі, раскіданыя гожымі латкамі па адхоністых берагох ядлоўчыкі, самотная магіла ля каменных сьценаў суворага храму ў Дакудаве. Праваслаўны сьвятар Іаган (!) Сьцяпура, што памёр у 1865-м, ягоная жонка Антаніна — у 1842-м, ды дачка Фёкла — у 1863-м, ляжаць пад адным дахам з фігурных чыгунных дошак.

А Рака ўсё жыве. Амаль кожную ноч вільготную цішыню абуджае гучны шматгалосы клёкат бусьлінае моладзі. Гэтулькі буслоў я ня бачыў ніколі. Сухія дубы зь велічэзнымі сухімі гнёздамі стаяць па высокіх берагох часам у дзесяці мэтрах адзін ад аднаго. І паўсюль — сьмешныя бусьляняты з чорнымі караценькімі дзюбамі й чорнымі танкімі нагамі. Аднаго разу патрапіўся запраўдны хмарачос з трыма, адзін над другім, паверхамі. І на кожным, закінуўшы дзюбатыя галовы, клекаталі белыя птахі.

Р.S. Вандроўка адбылася сёлета ў ліпені ў межах першага этапу экспэдыцыі «Залатое руно Панямоньня», наладжанай Беларускім сацыяльна-экалягічным аб'яднаньнем «Зялёны мір», Беларускім геаграфічным таварыствам і Менскім гарадзкім турысцка-экалягічным цэнтрам.

Андрэй Захаранка

ТАА"СОКТАС" **першы пастаўшчык у Беларусі**

СОДЫ КАЛЬЦЫЯНАВАНАЙ

Тэл.: (017) 210 42 19, Тэл./Факс: (017) 229 22 93

прыватныя абвесткі

Здаецца гараж у арэнду ў Сьцяпянцы. Тэл.: 271-31-03, Павал

Пазнаёмлюся з жанчынай прыгожай. Пра сябе: 47/169/80, жыльлём і матэрыяльна забясьпечаны. Маю в/а. 222160, Жодзіна, а/с 39

Сп. Міхась Казлоўскі, дзякую за дастаўку маёй абвесткі. Спадзяюся на далсйшую супольную працу. З павагай — Віктар Юрксвіч

«Малады фронт» Маладэчна абвяшчас: пастаўлсны **курс на сэксуальную рэвалюцыю** ў горадзс. Будзь разам з намі!

Шукаю ўсё, што мас дачынсньнс да «NRM». Дапамажыцс знайсьці CD гурта! Буду всльмі ўдзячная! 210001, Віцебск, вул. Цітовіча, 14—24, тэл.: 37-09-11

Шукаю зьвесткі пра беларускіх скаўтаў і іх дзсйнасьць да 1951 г. Буду ўдзячны за любую інфармацыю. Канстанцін. 220013, Мснск, а/с 365. Тэл.: 232-57-51

Пазнаёмлюся з жанчынай бальзакаўскага ўзросту. Алссь. 220073, Мснск-73, а/с 187

Бэзавую кветку з Днём народзінаў! Дзьвінскай роўнасьці ў жыцьці і каханьня на гіганцкіх абцасах

Віншую **Лявона Вольскага** з народзінамі. Адэля

Прадаю пчаліны мёд з экалягічна чыстага раёну, з разнатраўя, найвышэйшай якасьці. Кошт 4 у.а. за 1 кг. Тэл. у Бабруйску: 7-61-68, пасьля 19.00

Stała pradaju vialikalitoŭska-rasicjski **sloŭnik Jana Stankieviča**. 1305 staronak. Władzia. Tcl.: (375-17) 257-31-83. E-pošta: lutan@frcc.koti.com.pl

19 вераснья па адрасе: Мснск, Варвашэні 8 пройдзс **Цэнтральная Рада** Маладога Фронту

Вссьнік Бсларускас Ўльтра-Правіцы **«Слова Нацыі»**. Замаўляй: 220086, Мснск, а/с 121. (Ад Цябс — капэрта)

Хлопец (23) сымпатычны, адукаваны, разумны шукае надзейнага сябра ад 18 да 35 гадоў — хлопца. Магчымы сумесны здым кватэры і больш цёплыя адносіны. Захапленьняў шмат: музыка, вандроўкі, прэса — шмат чытаю.
Менск, 220073, а/с 187

Натальлю і Зьмітра Бабіных
віншуем з нараджэньнем ДАЧКІ!
Хай расьце здаровенькая і шчасьлівенькая!
Бацькі і брат

Наша Ніва 90 гадоў таму

Круцель-старавер

20 жніўня 1909 году

М. Гарадок, Віленск. губ. Вялейск. пав. Да пана К-кага, каторы прадае свой маёнтак Ліхачы, прыехаў нейкі жыд зь Вільні і падрадзіўся прыслаць багатага купца, калі толькі будзе яму за гэта факторства добры гасьцінец. Пан прыстаў на гэта. У скорасьці прыяжджае нейкі старавер да пасэсара таго пана К-кага ў фальварак Гаўрылоўшчыну; пачаў распытваць аб м.Ліхачах і папрасіў, каб яго туды завезьлі. К-кі завёз. Старавер, абгледзеўшы маёнтак і смачна паабедаўшы, вярнуўся ізноў да К-кага. Тут ён прызнаўся, што яму маёнтак гэны вельмі спадабаўся і хоча купіць яго, а тады прадаў бы яму — К-каму – гэты фальварак — Гаўрылоўшчыну. К-каму надта гэта прыпала да смаку, але стаў жаліцца, што грошы няхват. «Э-э, — кажа старавер, — не бядуй, я такі чалавек, што люблю другім памагчы, — памагу і табе, бо ўмею *качаць* грошы і табе *накачаю* колькі хочаш». Тут ён выняў з аднэй кішэні сторублёвую паперку, а з другой — дастаў чыстую паперу, скруціў іх, пакачаў і падае зара ўжо дзьве сторублёвыя К-каму і кажа: «Бяры пакуль што гэту новую паперку, і калі пойдзе ў ход, дык колькі ты мне дасі грошы, — я ўдвая накачаю табе новых, а цяпер адвязі мяне на станцыю». К-кі адвёз старавера, а назаўтра паехаў да м.Івянца і там з ахвотай разьмянілі яму гэтыя сто рублёў. Вярнуўшыся дадому, абляцеў суседзяў, пазычыў у іх 500 рубл., сваю тысячу з банку дастаў і чакае старавера. Праз колькі дзён прыяжджае і старавер зь нейкай скрыначкай; яго з пашанай спаткалі і завялі ў асобную каморку, дзе, як ён казаў, будзе качаць грошы, а тым часам паслаў К-кага, каб прыносіў свае на замен. Адлічыўшы паўтары тысячы рублёў, К-кі прыходзіць да старавера, ажно тут ужо вялікая куча накачаных сторублёвых паперкаў валяецца на стале. — «Давай-жа, — кажа старавер К-каму, свае грошы, — трэба іх разам злажыць, ды схаваць іх у скрынку — няхай улежацца, а ты мяне тым часам адвязі на станцыю, бо маю шмат яшчэ сваіх усялякіх спраў». Так і зрабілі; старавер, абяцаўшы ў скорасьці вярнуцца, ад'ехаў. Усю ноч К-каму ня спалася: рупіла яму глянуць у тую зачыненую скрынку, і як дзень, узяўшы сякеру і далато, чуць-чуць даў рады аддзёрці ў кованай жалезам скрынцы верх; калі гляне — ажно там ні сваіх, ні *качаных* грошэй няма, а нейкія толькі старыя газэты!..

Стэфан Брахалка

Газэта прымае таксама абвесткі большым шрыфтам за невялікую плату

*— да 20 словаў — **50 000** руб., звыш 20 словаў — **70 000** руб.;*
*— па-мастацку аформленая аб'ява **20 000** руб. за 1 кв. см.;*
*— па-мастацку аформленая аб'ява памерам больш за 24 кв. см з улікам кошту арыгінал-макету — ад **40 000** руб. за 1 кв. см.*
За аб'яву пра сямейныя падзеі — зьніжка.

Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пералічыць грошы праз пошту паводам на наступны разьліковы рахунак: *Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», р/р 3012213050010 Ленінскае аддз. «Белбізнэсбанку» г.Менску, код 763.*

На зваротным баку блянка паштовага пераводу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна і чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і АБАВЯЗКОВА ДАДАЕЦЦА СКАЗ: «ЗА РЭКЛЯМНЫЯ ПАСЛУГІ».

Рэдакцыя

паштовая скрынка

Д.К. зь Менску. *Правілы напісаньня прыназоўніка «з/зь» вызначаныя так: «зь» пішам перад словамі, якія пачынаюцца зь мяккай зычнай, апроч г, к, х (зь ліпай, але з кіём), а таксама перад словамі, якія пачынаюцца зь ётаванай галоснай (ё, е, ю, я, і — зь іх, зь імі, зь іншай, зь ёю, зь яе). Перад няётаванай «і» – найперш гэта запазычаныя словы – пішам «з» (з ініцыятывы, з інтарэсу, з інтэграцыяй).*

У.М. з Друцкаўшчызны. *Хай бы Вашых гісторыяў (французы называюць такія anecdote) было ў падборцы болей, але сьцісьлейшых, без аніводнага лішняга слова, тады надрукуем.*

Івану Л. зь Менску. *Наколькі мы ведаем, галоўная праблема падгародзкіх вёсак — бамжы. Газэта «Звязда» сябе ў Інтэрнэце ўвогуле называе «Zwyazda», але як яна гэта чытае?*

Яўхіму К. з Сумарокава. *Мы ў свой час ужо друкавалі вялікую рэцэнзію С.Санька на «После современности». Таму друкуем толькі: «Чакаем ад Вас, Іван Іванавіч, новых твораў, напрыклад, кніжкі: «Пасьля камунізму».*

«Наша Ніва» незалежная газэта, заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991. Галоўны рэдактар Сяргей Дубавец. Рэдактар выпуску Андрэй Дынько. Мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі. Адказны сакратар Аляксандра Макавік. Дызайн-макет Лявон Раманчык. Набор Насты Дзядзенкі. Выдавец: рэдакцыя газэты «Наша Ніва». Заснавальнік Павал Жук. Адрас для допісаў: 220050, Менск, а/с 537. Tel/fax: (017) 227-78-92. E-mail: niva@user.unibel.by Http://members.xoom.com/Nasa_Niva.

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

Наклад 2816. 6 палос фарматам А2. Нумар падпісаны ў друк 1:08, 13.09.1999. Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 4651. Кошт свабодны.
Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня N 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам па друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г.Менск, пр.газэты «Известия», д. 8, кв. 173.

НАША НІВА КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220050, Менск, а/с 537

Тэкст _____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____